ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес. . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. падатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

ПЯТНІЦА
18 Красавіка 1930 г.
№ 90 (3598)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

НОВЫЯ КРЭДЫТЫ КАЛГАСАМ, БЯДНЯЦКІМ І МАЛАМОЦНЫМ СЕРАДНЯЦКІМ ГАСПАДАРКАМ

На палёх БССР працуюць 400 трактараў.—Даб'емся безадкладнага пераводу іх на 3-х зьменную работу

Лепшыя заводы і фабрыкі павінны перадаць свой вытворчы вопыт калгасам

Крэдыты бядняцка-серадняцкім гаспадаркам на набыцьцё насеньня і коняй

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Для пармальнага забесьпячэньня засеўнай кампаніі ў паасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. З агульнай сумы вызначаных па крэдытным пляне сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту па машыназабесьпячэньне накіраваць 30 проц. на крэдытаваньне прасоўваньня машын у бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, з тым, аднак, калі запатрабаваньні калгасаў і саўгасаў будуць перавышаць вызначаныя для іх сумы паводле пляну, павялічыць суму крэдытаў па машыназабесьпячэньне, за рахунак іншых мэтавых прызначэньняў.

2 Вылучыць з рэзэрву Беларускай Канторы Саюзкалгасбанку 180 тыс. руб., з якіх 100 тыс. руб. на крэдытаваньне бядняцкіх, чырвона-партызанскіх і чырвонагвардзейскіх бясконных гаспадарак на набыцьцё коняй і 80 тыс. руб. на набыцьцё коняй для калгасаў з пераважна батрацка-бядняцкім складам.

3. У межах вызначаных па пляне крэдытаў на ўгнаеньне пасьля здавальненьня запатрабаваньняў абагулепага сэктару дапусьціць крэдытаваньне ўгнаеньнем бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

4. З мэтай пашырэньня травасеяньня і тэхнічных культур у бядняцка-серадняцкіх гаспадарках у раёнах з напрамкам жывёлагадоўлі і ільнаводзтва дапусьціць крэдытаваньне гэтых гаспадарак насеньнем траў і ільну ня менш 40 проц агульнай сумы вызначаных па пляну крэдытаў на гэтыя мэты.

5. Вылучыць для крэдытаваньня бескароўных бядняцкіх гаспадарак і былых чырвоных партызан і чырвонагвардзейцаў 200 тыс. руб. на набыцьцё рагатай жывёлы.

Нам старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. БЭНЗІК.
Нам. кіраўніка спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. ДУБАВІЦКІ.
15 красавіка 1930 г. г. Менск.

Крэдыты не скарыстаны

АЗАРЫЧЫ. (Па тэлефону). 26 калгасаў аб'ядноваюць 20 проц. гаспадарак Азарыцкага раёну. Усе калгасы пераведзены на новы статут і забясьпечаны насеньнем, машынамі і кормам. Крэдыты скарыстаны калгасамі ў разьмеры 45 проц., індывідуальнымі гаспадаркамі—на 5 проц.

8-га красавіка ў раёне пачалося ворыва. Калгасамі ўжо засеяна 12 проц. яравога кліну, індывідуальнымі гаспадаркамі засеяна 9 проц.

РАЁННАЯ КАМІСІЯ.

20 гадзін у суткі!

Прэміяваць лепшых трактарыстых і калёнаважатых

«Зьвязда» паведамляла гэтымі днямі аб тым, што трактары, якія ёсьць у беларускіх калгасах і саўгасах, не нагружаны, ня гледзячы на тое, што некаторыя калгасы адчуваюць нястачу ў цягавай сіле. Гэткія-ж весткі атрымліваю і Белкалгасцэнтр. Яму, акрамя таго, паведамляюць, што ў радзе калгасаў трактары не забясьпечаны гаручым.

У сувязі з гэтым Калгасцэнтр БССР учора запрапанаваў усім акруговым і раённым калгассаюзам, куставым аб'яднаньням і праўленьням калгасаў неадкладна прыняць меры да самага рацыянальнага выкарыстоўваньня трактараў.

Месцы павінны бездакладна праверыць, як забясьпечаны трактарныя калёны гаручым, змазачным матар'ялам і тарай для хаваньня гаручага. Калгасам запрапанавана стварыць двухтыднёвыя запасы гаручага. Трактары павінны працаваць ня менш 20 гадзін у суткі.

Калгасцэнтр БССР прапануе таксама разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж трактарнымі калёнамі на большае выкананьне заданьняў і лепшае ўзорваньне, па меншае выдаткаваньне гаручага і найлепшы ўход за трактарамі і прычэпным інвэнтаром. Абвяшчаецца конкурс на лепшага трактарыстага і калёнаважатага. На прэм'яваньне трактарыстых і калёнаважатых Калгасцэнтр БССР асигнаваў 3.000 руб.

Месцам прапануецца таксама зараз-жа ўвесьці прэм'яваньне трактарыстых і калёнаважатых за эканомію гаручага і выпрацоўку звыш вызначаных норм, пры умове добраякаснай работы і адпаведнага догляду машыны. Разьмер прэмій за эканомію гаручага складае, прыблізна, 50 проц. кошту з'эканомленага гаручага.

ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ

Праўленьне Белкалгаспаляводсаюзу, заслухаўшы весткі аб ходзе пасеўнай кампаніі ў акругах, пастанавіла запрапанаваць акруговым паляводсаюзам накіраваць зараз усю энэргію на выкананьне пляну кантрактацыі, прасоўваньне ў вёску с.-г. машын, насеньня і г. д. Пасьля задаваленьня патрэб калгасаў не абмяжоўваць водпуск сродкаў вытворчасьці паасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам.

Адначасова з правядзеньнем кантрактацыі трэба шырока разгарнуць работу па арганізацыі пасеўлічных вытворчых таварыстваў для абслугоўваньня індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

За ігнараваньне дырэктыў аб забесьпячэньні с.-г. машынамі індывідуальнага сэктару, хлусьлівыя весткі аб пабудове вапняных млыноў і механічнае заключэньне дагавароў на кантрактацыі праўленьне Магілеўскага акрпаляводсаюзу прыцягваецца да судовай адказнасьці.

За адмаўленьне продажу с.-г. машын індывідуальным гаспадаркам праўленьне Жлобінскага райсаюзу таксама прыцягваецца да адказнасьці.

За марудны збор попелу і неадгрузку яго на Наўліцкія балоты абвешчана вымова праўленьню Полацкага акрпаляводсаюзу.

Сваячасова і добра пачалі сяўбу

Калгасы «Чырвоны Артылерысты» і «Авангард» (Полацкі раён) шырока разгарнулі палявыя работы. Абодва калгасы сваячасова і добра падрыхтаваліся да сяўбы. Увесь с.-г. інвэнтар адрамантаваны, гатунковае насеньне ачышчана цалкам. Кожны калгасьнік добра ведае яравы клін і поле паасобнай культуры. Дысцыпліна ў гэтых калгасах знаходзіцца на належнай вышыні. Калгасы падаюць прыклад вакольнаму сялянству.

Калгас «Чырвоны Артылерысты» арганізаваўся ў жніўні 1929 году з 18-ці дэмабілізаваных чырвонаармейцаў. Зараз-жа ў калгасе ўжо налічваецца 65 гаспадарак. Камунары разьбіты на брыгады па галінах сельскае гаспадаркі. Вытворчы і рабочы пляны былі абгавораны на сходах калгасьнікаў. З пачаткам палявых работ калгас перайшоў на 5-піразрадную сетку аплаты працы. №-ская артылерыйская брыгада—шэф калгасу — дапамагае яму заараць яравы клін і прыслала ў калгас 6 коняй на два тыдні. Калгасьнікі заворваюць па 20 гэкт. кожны дзень. У калгасе ёсьць 135 кароў, гадуецца 50 цялят. У калгасе арганізаваны сталоўка і дзіцячыя ясьлі.

Калгас «Авангард» арганізаваўся восенью 1928 г. з 10 гаспадарак, а зараз уврос да 50 гаспадарак на плошчы ў 475 гэкт. Калгас зараз пашырае яравы клін за лік засеву папару, зарасьнікаў і г. д. За першыя два дні палявых работ калгасам заарана 30 гэктараў. Догляд за коньмі вельмі добры. У калгасе абагулена ўся рабочая і малочная жывёла. Калгасьнікі адмовіліся браць сваіх кароў назад, кажучы «тут ім будзе лепш».

Брыгадзіры «Зьвязды»
ХАЛЯВІН, МІНОВІЧ.



КОННАЯ СТАНЦЫЯ Ў КАЛГАСАХ КЛІМАЎШЧЫНЫ.

Канчаюць ворыва

МАГІЛЕЎ. (Па тэлефону ад нашага кар-та).

У большасьці калгасаў Магілеўшчыны ворыва знаходзіцца ў поўным разгары. На 15-га красавіка калгасамі Бялыніцкага раёну ўжо заарана 37 проц. яравога кліну, а ў паасобных калгасах гэты процант дасягае 60-65.

Большасьць калгасаў Крычаўскага раёну ўжо прыступіла да засеву палёў, засеяна 85 гэкт.

У Чэрыкаўскім раёне ў большасьці калгасаў ворыва скончана. На 15-га красавіка засеяна 287 гэкт. ячменю.

У Лупалаўскім раёне ўсе калгасы ўжо вышлі ў поле, частка скончыла ворыва. Калгас «Камінтэрн», напрыклад, заараў 300 гэкт. і засеяў 22 гэкт. лубіну. У Магілеўскім раёне з 40 калгасаў 26 ужо вышлі ў поле і на 15-га красавіка ўзаралі звыш 600 гэкт.

Сераднякі прыцягнуты да кіраўніцтва калгасамі

ГОМЕЛЬ. (НАШ КАР.). У ЦЭРАХАЎСКІМ РАЁНЕ СЕРАДНЯКІ ПРЫЦЯГНУТЫ ДА КІРАЎНІЦТВА КАЛГАСАМІ. У ГАРДУНОЎСКІМ, ЧЭРЫЦЯНСКІМ І БУДЗІШЧАНСКІМ КАЛГАСАХ СЕРАДНЯКІ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА СТАРШЫНЯМІ ПРАЎЛЕНЬНЯЎ. ЯНЫ ПРАЯЎЛЯЮЦЬ СЯБЕ ЯК ДОБРЫЯ ГАСПАДАРНІКІ І КАРЫСТАЮЦЦА АЎТАРЫТЭТАМ СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ. У БУДЗІШЧАНСКІМ КАЛГАСЕ ДА 15 КРАСАВІКА БЫЛО СКОНЧАНА ВОРЫВА. ЧЭРЫЦЯНСКІ КАЛГАС ТАКСАМА СТАРАННА ПРАВОДЗІЦЬ ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ.

АМАЛЬ ПА ЎСІМ РАЁНЕ НАГЛЯДАЕЦЦА ЗАРАЗ ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ. У ЦЭРАХАЎСКІ КАЛГАС НЯДАЎНА ЎСТУПІЛА 16 ДВАРОЎ. У ВЁСКАХ, ДЗЕ АРГАНІЗАВАНЫ КАЛГАСЫ, ЯРАВЫ КЛІН ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА НА 30 ПРОЦ. ЗА ЛІК ВОЛЬНЫХ ЗЯМЕЛЬ.

„Джон-Дзіры" на койданаўскіх палёх

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Таварны з Новарасійску прышоў у Койданава шостага красавіка вечарам. На пляцформах, у перакрэсьленых надпісамі скрынях, сталі трыццаць тры трактары «Джон-Дзір», трыццаць тры чатырохлямешныя плугі «Оліфэр», адзінаццаць сашніковых сявалак і трактарныя цялежкі. Сотня хлапцоў і дзяўчат, якія пасьпелі толькі шэсьць тыдняў правучыцца на трактарных курсах Койданаўскай МТС, цягнулі скрыні з пляцформ, разьбівалі жалезныя абручы і браліся за зборку. Месца каля пакгаўзу было завалена дошкамі і панерай. Чатыры дні і чатыры ночы маладыя трактарыстыя ладзілі машыны.

Рабочы дзень расьцягваўся да 12-14 гадзін. Рэшту ночы вартавалі машыны —на варце.

«Джон-Дзіры» ня былі знаёмы — вучыліся на «Фордзону». І злосьць, і тут брала трактарыстых, калі яны знаходзілі ў скрынях тоўстыя пакункі з размаляванымі кніжкамі, старонкі якіх гаварылі, мусіць, аб самым галоўным — аб канструкцыі, аб частках, аб хваробах машыны. І вось гэтыя старонкі заставаліся недасяжнымі, таемнымі, далёкімі, як тая краіна, адкуль іх даслалі. Нідзін з трактарыстых ня ведаў ангельскае мовы. На станцыі таксама ніхто ня мог узяцца за пераклад і сакрэты «Джон-Дзіра» ня былі выкрыты.

Распаўзьліся па раёне ротамі і ўзводамі — па дзесяць, па пяць, па дзьве машыны ў калгас.

Беларускія дарогі далі сябе адчуць. Зялёныя амэрыканскія сталёвыя госьці сярдзіта тарахцелі, садзіліся на заднія лапы і буксавалі. Трактарыстыя падкідалі пад калёсы палкі. Учапіўшыся за іх, машына выкарабкваліся в бруду, перабіраючы, як рак шпорамі-кляшнямі.

З двароў бегалі насустрач машыне дзеці. Сялянне маўкліва і сур'ёзна разглядалі трактар. Старыя жанчыны закрывалі твар худымі рукамі: за іх кастлявымі зморшчанымі пальцамі трапятаў жах.

«Фардзону» — дзесяць на пятнаццаць. Калгасы атрымалі дапамогу, без якой плян веснавых работ апынуўся пад рэальнай пагрозаю зрыву. Мала рабочых рук, мала цягавай сілы, а зямлі багата —дваццаць процантаў зямельнае плошчы раёну. Прасторы чакаюць калгаснага плугу.

Трактарыстыя робяць сваю справу з энтузіязмам, але сэрца точыць чарвяк трывогі. Гэта-ж няма літаральна ніводнае запаснае часткі і хто ведае — ці ёсьць ва ўсім СССР запасныя часьці для «Джон-Дзіраў»?

Калі ў аднаго трактарыстага зламалася пусьцяковая вілачка, цаною ў 50 капеек, а ў другога—двухплечны вагарок, а ў трэцяга—вось,—станцыя вымушана была пайсьці на ахвяру: адзін трактар разадралі на кавалкі і залячылі раны пакалечаных машын. Адна машына на вышла са строю ў дні, калі рэспубліка задыхаецца ад вострага недахопу цягавай сілы і ў Койданава прыяжджаюць калгасьнікі з Самахвалавіцкага і Вузьдзенскага раёнаў і просяць прысласць да іх «хаця-б адзін трактар».

Сёньня разабралі адну машыну і залячылі раны, але-ж заўтра ў слаба кваліфікаваных і гарачых трактарыстых можа здарыцца другая трасца — перагарыць сьвяча, зграець дыскі, сапсуецца матор. Пытаньне аб запасных частках вісіць, як Дамоклаў меч, і трэба аб гэтым сказаць поўным голасам, трэба біць трывогу, трэба браць рашучыя меры.

На поле да трактарыстых прыходзяць людзі з вёсак. Пажылыя сяляне пужліва сядзяць на крылышах трактараў, трымаюцца абедзьвюма рукамі за ражок. «Добра арэ бальшавіцкі конь»... «Ай-ай, як бушуе, ай чорт, ай сіла»... Якімі вачыма будуць глядзець цяпер гэтыя сяляне на сваё порканае ў зямлі з старэнькай, бяззубай сахой? У вёсцы Мельковічы сяляне пасярод поля, на радыятарах трактараў, пісалі заявы аб уступленьні ў калгас імя таварыша Войкава.

Часам машына нямее, трактарысты саскокваюць з крэсла і лаецца. У радыятары кіпіць вада. Няма вады. Калгас ня здолеў арганізаваць падвозку на поле вады і гаручага. Рулявы ідзе ў лагчыну і выбірае пачарнелыя кавалкі сьнегу, каб астудзіць матор.

У гэты час машына стаіць.

У той дзень калі я быў у калгасе «Новае Жыцьцё», Нарэйкаўскага сельсавету, трактарыстыя сталі з прычыны адсутнасьці вады і газы з гадзіны. У саўгасе «Негарэлае» па той самай прычыне быў пяцігадзінны парстой трактараў.

У гэтым самым саўгасе 17 чалавек трактарыстых галадавалі два дні з прычыны тупой «эканоміі» і бязьніцыцтыўнасьці загадчыка Розэнгарда. Людзі ў халодныя вясеньнія ночы спалі ля вогнішча (у аднаго загараўся прамасьлены рукаў курткі і абгарэла рука), пілі ваду зьмяшаную з газай і ўсё-ж працавалі—працавалі па - ўдарнаму, заворваючы па 5 гэктараў на машыну. Толькі стойкасьцю і дысцыплінаванасьцю камсамольскага ядра можна растлумачыць той факт, што работа ў саўгасе ня спыняліся, але і камсамольцы пад канец пачалі здаваць. Умяшальніцтва «Зьвязды» і райкому партыі паклала канец гэтым зьдзекам.

На чарзе — пытаньне аб аплаце маладшых і старэйшых рулявых, аб заключэньні дагавароў з індывідуальнікамі, аб эканомным выкарыстаньні гаручага і зьдзельнай рабоце. Калгасаюз вельмі мала цікавіцца ўсім гэтым. На прапанову МТС сумесна разгледзець актуальнейшыя і вастрэйшыя пытаньні ён адказаў халодным роўнадушшам бюракратычнай адніскі.

Першая на Беларусі машына-трактарная станцыя працуе амаль што адзінока. Новыя праблемы, новыя задачы, а практыкі ніякай. У загадчыка станцыі тав. Макарэвіча — чырвоныя вочы і памяты пінжак, ён не дасыпае другі месяц.

Трактарныя атрады заключаюць паміж сабою дагавары на сацыялістычнае спаборніцтва.

Трактарысты — ня толькі рулявы, ён перадавы салдат арміі сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі.

Сяўба ідзе.

Койданава.

МІХАСЬ ГОЛЬДБЭРГ.

САВЕЦКА-АНГЕЛЬСКАЯ ГАНДЛЁВАЯ ЗГОДА

Падпісаная ўчора ў Лёндане гандлёвая згода паміж СССР і Вялікабрытаніяй прадстаўляе сабою факт, глыбока навучальны і варты ўвагі шырокіх плястоў працоўных нашага краю.

У 1924 годзе першы ўрад Макдональда падпісаў з Савецкім Саюзам гандлёвы дагавор і агульны палітычны дагавор, якія навінны былі зьявіцца правовой падставай ва ўзаемаадносінах паміж абодвума краямі. Аднак, у канцы таго-ж 1924 году «рабочы ўрад» павінен быў уступіць месца кансэрвацыўнаму габінэту Бальдвіна—Чэмбэрлэна, першым крокам якога было адмоўць у ратыфікацыі падпісаных урадам Макдональда дагавароў, якія аказаліся лішнім мёртванароджанымі.

Потым, тры гады назад, 12 мая 1927 году славуты міністар-узломшчык місіяр Хікс арганізаваў налёт сваіх паліцэйскіх дружыньнікаў на наша гандлёвае прадстаўніцтва і на «Аркос», пасьля чаго адбыўся разрыў дыплёматычных зносін і ануляваньне падпісанае ўчора ў 1921 годзе часовае згоды.

Амаль 3 гады мінула з гэтага моманту. І вось мы бачым, што брытанскага ўраду даводзіцца зноў ісьці па шляху згоды з Савецкім Саюзам.

Зьмест падпісанае ўчора згоды зводзіцца ў асноўным да наступных двух момантаў: папершае, абодвы бакі забавязваюцца ўжываць прынцып найбольшага ўпрывілеяваньня ў адносінах тавараў, грамадзян і гаспадарчых арганізацый другога боку. Падругое, згода, выводзячы з існуючай у СССР манаполіі мясцовым гандлі, гарантуе правы эксцярытарыяльнасьці за кіраўнікамі савецкага гандлёвага прадстаўніцтва і за памяшканьнем, якое займаецца апошнім.

Згодаю дакладна ўстанаўляюцца межы дзейнасьці гандлёвага прадстаўніцтва. Апошнае бярэ на сябе поўную адказнасьць за ўсе дагаворы, што заключаюцца гэтым гандальпрадстаўніцтвам на тэрыторыі Вялікабрытаніі. Адначасова ўстанаўляецца, што за зьдзелкі, якія заключаюцца з іншымі гаспадарчымі арганізацыямі, адказнасьць нясуць толькі паведныя арганізацыі. Гэтым самым прыпяджваецца магчымасьць злонамерных і нядобрасумленных «судовых» нападкаў, падобных тым, сьведкамі якіх мы зьяўляемся з дня ў дзень ва Францыі ў адносінах да нашых гаспадарчых органаў.

Практычнае значэньне гандлёвае згоды заключаецца ў тым, што яна падводзіць пад нашы эканамічныя ўзаемаадносіны з Вялікабрытаніяй выразную прававую базу. Патрэба такой базы ясна выступае на фоне апошніх падзей у Францыі.

Сэнс і значэньне падпісанае ўчора ў Лондане згоды ня вычэрпваюцца, адзначаючы сферай эканамічных узаемаадносін. Лёндонская згода зьяўляецца, безумоўна, буйным дасягненьнем нашай пасьлядоўнай і цьвёрдай палітыкі. Пасьляхо-

...асовы ангельска-савецкі гандлёвы дагавор падпісаны

ТАВ. САКОЛЬНІКАЎ АБ ПАДПІСАНЬНІ ГАНДЛЁВАЕ ГЗОДЫ

ЛЁНДАН, 16. Сёньня а 5 гадзіне дня падпісана часовая гандлёвая згода паміж Англіяй і СССР. (ТАСС).

...ДПІСАНЬНЕ ДАГАВОРУ — РЭАЛЬНЫ КРОК ДА СТВАРЭНЬНЯ ТРЫВАЛОЙ БАЗЫ ДЛЯ АНГЕЛЬСКА-САВЕЦКІХ ГАНДЛЁВЫХ АДНОСІН

ЛЁНДАН, 16. У гутарцы з прадстаўніком ТАСС савецкі паўнамоцны прадстаўнік у Лёндане тав. Сакольнікаў адзначыў, што падпісаньне ангельска-савецкае гандлёвае згоды зьяўляецца рэальным крокам да стварэньня трывалай базы для ангельска-савецкіх гандлёвых адносін.

Падпісаньне згоды,—заявіў т. Сакольнікаў,—будзе бясспрэчна прынята з вялікаваньнем працоўнымі масамі Англіі, якія зацікаўлены ў ажыўленьні ангельска-савецкага гандлю, што можа выйці паслабленьню беспрацоўя ў Англіі. Новы дакумант будзе таксама сустрэчаны з адабрэньнем тымі дзелавымі коламі Англіі, якія, наглядваючы эканамічны ўздым СССР, разумеюць, што іх выгады ляжаць на шляху эканамічнага супрацоўніцтва з Савецкім Саюзам. Можна чакаць, што дагавор выкліча нападкі толькі з боку тых груп, якія захоплены фантастычным плянам барацьбы супроць СССР.

Той факт, што згода зьяўляецца часовай, не паслабляе эканамічнага і палітычнага значэньня гэтага дакументу, бо зараз-жа пасьля падпісаньня згоды, пачнуцца перагаворы аб заключэньні пастаяннага дагавору. Акрамя таго, зьмест падпісанай згоды ўжо зьяўляецца ў значнай меры вырашэньнем асноўных пытаньняў арганізацыі гандлёвых адносін паміж Англіяй і СССР».

У заключэньне т. Сакольнікаў выказаў надзею, што на аснове заключанай згоды будзе дасягнута сапраўднае пашырэньне ангельска-савецкага гандлю, што ў сваю чаргу паслужыць падставаю для здавальняючага вырашэньня і іншых пытаньняў, якія падлягаюць далейшаму абгаварэньню. (ТАСС).

У фашысцкай Польшчы

ПАЛІЦЫЯ ЎДАСКАНАЛЬВАЕ ТЭХНІКУ ЗАБОЙСТВА РАБОЧЫХ

ВАРШАВА, 16. Польская паліцыя дастасоўвае ў барацьбе супроць вулічных выступленьняў рабочых усе навейшыя вынаходкі. Зараз, напрыклад, уведзены ў польскай паліцыі газавы разьвэр, які страляе атрутнымі газамі.

«Газэце Варшаўскай», № 107, мы знаходзім апісаньне інсцынізацыі вулічнага ...паліцыі з «бандытамі», пры якіх паліцыя ўжывала газавыя рэвальвэры.

...350 РАБОЧЫХ ВЫКІНУТЫ НА ВУЛІЦУ

ВАРШАВА, 16. Фабрыка Бэстэн у Кушы, на якой разыгралися нядаўна бурныя падзеі сутычкі рабочых з паліцыяй, закрыта адміністрацыяй на няпэўны час. 1.300 рабочых засталіся без работы. (ТАСС).

...ОЧЫЯ СПАТКАЛІ ПАЛІЦЫЮ ГРАДАМ КАМЯНЕЎ

ВАРШАВА, 16. У Сасновіцах (Дамбровскі басэйн) 2.000 беспрацоўных заняли магістрат, патрабуючы адпаўленьня грамадзкіх работ і выдачы дапамогі. Наступіўшую супроць беспрацоўных паліцыю рабочыя сустрэлі градам каменьняў. У часе сутычкі паміж беспрацоўнымі і паліцыяй паранена 4 беспрацоўных і пекалькі паліцэйскіх. (ТАСС).

ПОЛЬСКІЯ ФАШЫСТЫЯ ПРЫКІДВАЮЦЦА НАІЎНЫМІ

ВАРШАВА, 16. Выступленьне лідэра нацыянал-дэмакратаў Дмоўскага ў «Газэце Варшаўскай» з выкрыцьцямі антысавецкіх ваенных плянаў ускалыхнула ўсю польскую прэсу. Асабліва хваравіта рэагуе прэса пілсудчыкаў. «Сэнс артыкулаў Дмоўскага—заяўляе «Кур'ер Паранны»—зусім ясны. У іх не ўспамінаецца імя маршала, але паміж радкоў іменна на маршала паказваецца, як на таго, хто падрыхтоўвае вайну з СССР у інтарэсах эўрапейскага капіталу».

«Газэта Польска» не зразумее, чаму «Известия» патрабуюць у сувязі з артыкуламі Дмоўскага заяў з боку польскага ўраду. Хіба «Известия» забылі — піша газэта—колькі разоў Польшча ў апошні час дэманстравала сваю стойкую волю да міру з СССР. Узяць хаця-б Маскоўскі пратакол. Сэнатар Касоўскі, зьдзіўляецца ў перадавым артыкуле газэты «Кур'ер Варшаўскі», чаму Патэк ня здолеў да гэтага часу ўзьдзейнічаць на польскі ўрад, каб апошні выступіў з заявай, якая палажыла-бы канец кампаніі па абвінавачаньні Польшчы ў ваяўнічых плянах. (ТАСС).

ЛЕВЫЯ ФРАЗЫ ПОЛЬСКІХ СОЦЫЯЛ-ФАШЫСТЫХ

ВАРШАВА, 16. Тры сялянскія партыі «Пяст», «Вызваленне» і «Сялянская ...тыя» на супольным пасяджэньні палілі рэзалюцыю, у якой гаворыцца: «Абная сялянская гаспадарка скочвае ў бяздоньне, уся краіна перажывае ...кі гаспадарчы крызіс, усе непасільна падаткаваны. Усе, хто кіруе краінай, ...ць вялізарныя сумы і ня хочуць ...сьціць кантролю з боку сойму. Пра...дэпутатаў разгледзець у сойме зло...ваньні цягнуць за сабой крыўду і ...кі. Сойму не даюць магчымасьці працаваць. З прычыны гэтага парляманцкія клюбы «Вызваленьня», «Сялянскай партыі» і «Пяста» рашаюць узгадняць свае выступленьні як у сойме, так і ў краіне з тым, каб стварыць сялянскі фронт для абароны гаспадарчых інтарэсаў і палітычных правоў сялянства».

У палітычных колах гэту рэзалюцыю расьцэньваюць, як першы крок да ажыўленьня агульнага выбарчага блёку гэтых партый на выбарах у сойм, калі такія сапраўды адбудуцца. (ТАСС).

...ацэс контр-рэвалюцыянэраў і шкоднікаў з лясной гаспадаркі Украіны

ХАРКАЎ. Надзвычайная сэсія Вярхонага суда УССР пачала слухаць справу аб вялікіх злоўжываньнях і ...ляжках, выкрытых органамі ДПУ ...лясной гаспадарцы Украіны. На ...ды падсудных 127 чалавек. Усім ...прад'яўлена абвінавачваньне па ...ых артыкулах крымінальнага ...ку, які прадугледжвае падрыў пра...мысловасьці і гандлю з контр - рэвалюцыйнымі мэтамі, хабарніцтва, падлогі і скарыстаньне свайго службовага становішча і г. д.

92 падсудных прызналі сябе вінаватымі безагаворачна або часткова. 35 падсудных свае віны ня прызнаюць наперакор відавочным доказам і фактам. ...ял-дэмакраты. Рашуча пратэстуючы супроць уцягваньня Латвіі ў вайну з СССР, заяўляю ад імя працоўных—«Рукі прэч ад рабочае дзяржавы». (ТАСС).

НОВЫ ТРАНСПАРТ ЗБРОІ ДЛЯ ПОЛЬШЧЫ

БЭРЛІН, 16. «Дэйчэ Альгемэйнэ Цэйтунг» паведамляе з Данцыгу, што 15-га красавіка, паводле просьбы польскага ўраду, будзе закрыта для звычайнага гандлёвага руху паўночная частка гавані, бо там будуць разгружацца прыбыўшыя для польскай арміі ўзрыўчатыя матэрыі. (ТАСС).

ПЕРШЫ ЎЗНОС НА ПАБУДОВУ ДРУГОГА БРАНЯНОСЦА

БЭРЛІН, 16. Камісія рэйхстагу ўхвалила прапанову нацыяналістых, падтрыманую членамі ўраду, уключыць у бюджэт першы ўзнос у разьмеры 2,9 млн. марак на пабудову другога браняносцу. (ТАСС).

Магілеўскі Паляводсаюз і сельбанк зрываюць сяўбу на кармяншчыне

МАГІЛЕЎ. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).

У выніку бязьдзейнасьці Магілеўскага акрпаляводсаюзу і сельбанку зрываецца сяўба ў Кармянскім раёне. У раёне ёсьць 38 калгасаў, якія ў большасьці аб'ядноўць бясконных беднякоў. Каб сваячасова засеяць яравы клін, калгасам патрэбна набыць 200 коняй. Райпаляводсаюзам савячасова была дана заяўка на водпуск крэдытаў для гэтай мэты. Былі зроблены два напамінаньні Сельбанку, загадчыку акрпа, акруговаму паляводсаюзу, але ўсе яны маўчаць па сёньнешні дзень. Такая няўважлівасьць і нядбайнасьць акруговых установаў, якія сваячасова не забясьпечылі калгасы Кармянскага раёну сродкамі на набыцьцё цягавай сілы, стварае пагрозу зрыву сяўбы ў 12-ці калгасах.

Кармянскім райкалгассаюзам была таксама сваячасова дана заяўка аб водпуску кармавога аўсу на веснавую сяўбу. Паляводсаюз мог задаволіць гэту заяўку, бо ў Карме ляжыць 52 тоны аўсу. Але акрпаляводсаюз замест гэтага дае нарад на адгрузку аўсу ў Быхаў, а Кармянскі раён пакідаецца без патрэбнага корму.

Кантрактацыя ў раёне сарвана. На 15-га красавіка заключаны толькі чатыры кантрактацыйныя дагаворы з індывідуальнымі гаспадаркамі і адзін групавы дагавор. У поле дасюль выйшлі толькі паасобныя вёскі.

ЦІ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ КАЛГАСЫ КАРМАМІ?

За апошні час рэдакцыя атрымала рад вестак з розных раёнаў БССР аб тым, што становішча з кармамі для рабочай і прадукцыйнай жывёлы вельмі дрэннае. У некаторых мясцох запас кармоў як грубых, так і канцэнтраваных ёсьць толькі па 2-3 дні.

Наш супрацоўнік зьвярнуўся накопт гэтага ў Белмалжывсаюз, які адказаў, што «справа з забесьпячэньнем калгасаў кармамі абстаіць ня дрэнна. Наркамгандлем выдзелена 200.000 пудоў аўсу для рабочай скаціны калгасаў і для машына-конных станцый. Гэты авёс ёсьць на мясцох у веданьні Саюзхлеба і сыстэмы Белпаляводсаюзу. Пакуль што гэтай колькасьці аўсу хопіць. Што-ж датычыць грубых кармоў, дык калгасы павінны самі сябе забясьпечыць. Белмалжывсаюз даў паказаньні акругам аб паяўнасьці грубых кармоў у Смаленшчыне з тым, каб акруговыя малжывсаюзы і паляводсаюзы выехалі туды закупіць кармы».

Здаваліся-б, што ўсё ў парадку, Паводле наказапага паведамленьня непакоіцца аб кармох ня прыходзіцца. Але-ж чым тады тлумачыць трывожныя весткі, якія паступаюць з месц?

Падрыхтоўка вайны супроць СССР

РЫГА, 16. У спрэчках па вайсковым бюджэце ў Латвійскім сойме выступіў с.-д. дэпутат Бруно Кальніш, які папракаў вайсковае кіраўніцтва ў тым, што яно не дастаткова клапоціцца аб узбраеньні і навучаньні латвійскай арміі.

Дэпутат рабоча-сялянскай фракцыі Яршоў рэзка выступіў супроць уцягвання Латвіі ў падрыхтоўцы новай вайны — вайны супроць СССР і ганьбіў паводзіны сацыял-дэмакратаў. Зазначыўшы на супрацоўніцтва генэральных штабаў Латвіі і Польшчы, на вялікі процант былых расійскіх белагвардзейскіх афіцэраў у складзе латвійскай арміі, на рост ваенных асыгнаваньняў, якія павялічваюцца штогод, Яршоў закончыў: «Латвія ўваходзіць у склад тых дзяржаў, якія рыхтуюць ваеннае выступленьне супроць СССР. У падрыхтоўцы вайны, на меры сваіх сіл і здольнасьцяй, прымаюць удзел латвійскія сацыял-дэмакраты. Рашуча пратэстую супроць уцягваньня Латвіі ў вайну з СССР, заяўляю ад імя працоўных—«Рукі прэч ад рабочае дзяржавы». (ТАСС).

НОВЫ ТРАНСПАРТ ЗБРОІ ДЛЯ ПОЛЬШЧЫ

БЭРЛІН, 16. «Дэйчэ Альгемэйнэ Цэйтунг» паведамляе з Данцыгу, што 15-га красавіка, паводле просьбы польскага ўраду, будзе закрыта для звычайнага гандлёвага руху паўночная частка гавані, бо там будуць разгружацца прыбыўшыя для польскай арміі ўзрыўчатыя матэрыі. (ТАСС).

ПЕРШЫ ЎЗНОС НА ПАБУДОВУ ДРУГОГА БРАНЯНОСЦА

БЭРЛІН, 16. Камісія рэйхстагу ўхвалила прапанову нацыяналістых, падтрыманую членамі ўраду, уключыць у бюджэт першы ўзнос у разьмеры 2,9 млн. марак на пабудову другога браняносцу. (ТАСС).

Кітайская чырвоная армія разбройвае „карныя атрады“

Урадавае войска дапучаецца да паўстанцаў

ШАНХАЙ, 14. Кітайская прэса прыводзіць супярэчныя весткі аб становішчы чырвоных атрадаў на поўначы правінцыі Гуандунь. Нанкінская прэса сьцьвярджае, што камуністычныя атрады разьбіты і вымушаны былі вярнуцца ў правінцыю Цзянсі.

Другія газэты падаюць, што раён Нансюнь застаецца ў руках камуністых. Упадаю паспаны туды аэрапляны і войска, аднак, апошнія часткова разьбіты, а часткова дапучыліся да чырвоных атрадаў.

Газэта «Цзян Нан Ван-бао» паведамляе, што войскі, паспаныя ва ўсходнюю часьць правінцыі Цзянсі супроць камуністычных атрадаў, абкружаны апошнімі і разброены. Паводле заявы газэты, «камуністыя» атрымалі такім чынам вялікія запасы зброі і амуніцыі.

Газэта таксама адзначае, што насельніцтва аб кожным кроку ўрадавых войск сваячасова даводзіць да ведама штабу чырвоных атрадаў і таму барацьба з паўстанцамі вельмі ўтрудняецца.

Савецкая ўпада ў Фуцьзяне

ШАНХАЙ, 16. Ангельская газэта «Саут Чайна Морнінг Пост» піша, што камуністыя стварылі савецкі ўрад, упада якога пашыраецца на раёны гарадоў Луньян-чжоу, Шанхан і Яньцін у заходняй часьці Фуцьзянскай правінцыі.

Савецкі ўрад рэарганізаваў свае войскі і сфармаваў тры палкі. Штаб чырвонай арміі зьмяшчаецца ў Луньячжоу. Ва-ўсіх раёнах, занятых чырвонымі атрадамі, дзяржаўныя і прыватныя школы абарочаны ў школы ленінізму, у якіх выкладаюцца асновы камуністычнага навучаньня.

«Саут Чайна Морнінг Пост» піша ў заключэньне, што ў апошнія гады чырвоныя войскі паступова павялічваліся колькасьцю і напаўнялі свае ўзбраеньні, таму яны зьяўляюцца сілаю, з якой ня лёгка справіцца.

* * *

ПЕКІН, 14. Пазаўчора ў Цянь-цьзіне (буйны партовы горад паўночнага Кітаю) пашыраліся камуністычныя лістоўкі. Група асоб зьявілася ў рэдакцыю мясцовай буржуазнай газэты «Такунбао» і патрабавала надрукаваньня ў газэце камуністычнае першамайскае адозвы. Атрымаўшы адмову, прышоўшыя разбурылі частку памяшканьня рэдакцыі. Некаторыя з іх арыштаваны.

АПЛЯВУХА ШВЭДЗКАЙ БУРЖУАЗІІ ШВЭДЗКІЯ КАЛЕНІСТЫЯ ВАРОЧАЮЦЦА НАЗАД У СССР

СТАКГОЛЬМ, 15. Газэта «Нью Таг» (камуністычная) паведамляе, што яшчэ 7 сямей, з ліку пакінуўшых нядаўна СССР швэдзкіх калёністых, падалі заяву з просьбаю дазволіць ім вярнуцца ў СССР. У сваёй заяве швэды-калёністыя зазначаюць:

«Мы ня хочам быць нявольнікамі швэдзкіх кулакоў і садзейнічаць зьнижэньню зарплаты швэдзкіх рабочых. Мы поўнасьцю сымпатызуем рабочым і сялянам Савецкага Саюзу і іх рабоце па сацыялістычным будаўніцтве. Мы хочам вярнуцца дамоў — у нашу сапраўдную бацькаўшчыну».

Расчараваньне швэдзкіх сямей, якія выселіліся з СССР, за апошні час асабліва ўзмоцнілася ў сувязі з неатрыманьнем зямлі швэдамі і наўдалым канцом перагавораў аб перасяленьні гэтых швэдзкіх сямей у Амэрыку. (ТАСС).

ПОЛЬСКАЯ НОТА НЯМЕЧЧЫНЕ

БЭРЛІН, 16. У нямецкім міністэрстве замежных спраў атрымана нота польскага ўраду, накіраваная супроць ухваленых рэйхстагам павышаных мытных аплат. Польскі ўрад заяўляе, што павышэньне мытаў супярэчыць жэнэўскім згодам і парушае польска-нямецкі гандлёвы дагавор. (ТАСС).

* * *

ВАРШАВА, 16. «Кур'ер Кракаўскі» у перадавым артыкуле адносна павышэньня Нямеччынай мытных аплат заяўляе: на павышэньне аграрных пошлін у Нямеччыну, польскі ўрад павінен адзначыць адхіленьне ўсяго польска нямецкага гандлёвага дагавору ў цэлым з адначасовым абастрэньнем усіх сродкаў мытнай вайны з Нямеччынай. (ТАСС).

Аэрапляны бяз пётчыкаў

ЛЁНДАН, 14. Нядаўна ў Англіі рабіліся выпрабаваньні прылад для кіраўніцтва самалётамі з зямлі. Цэлая эскадрылія бомбавозаў, абсталяваная гэтымі прыладамі, канструкцыя якіх зьяўляецца ваеннаю тайнаю, зрабіла пералёт у 400 міль. Лётнікі, якія знаходзіліся на самалётах, самі кіравалі імі толькі ў часе пад'ёму і пасадкі. У Францыі быў зроблены вопыт з іншымі прыладамі.

Памяці Ў. У. Маякоўскага

Каля труны паэты

МАСКВА, 16. Учора раніцаю, яшчэ задоўга да адкрыцьця доступу да цела паэты Маякоўскага, доўгая чалавечая істужка працягнулася ад варот клюбу пісьменьнікаў, па вуліцы Вароўскага да пляцу Паўстаньня і накіравалася на вуліцу Бэрсона. У гэтай істужцы — рабочыя, служачыя, вузаўцы, чырвонаармейцы. Больш усяго моладзі — рабочай, вучнёўства. Шмат дзяцей, якія прышлі арганізавана — поўнымі піянэр-атрадамі, групамі з школ і дзіцячых дамоў. Усе сходы і калідор клюбу — у кветках. З кожнай гадзінай кветак становіцца ўсё больш і больш, іх прыносяць з сабою прышоўшыя.

Вайсковую варту нясуць чырвонаармейцы Маскоўскай пралетарскай дывізіі, аркестр, гэтай-жа дывізіі, іграе жалобны марш Шопэна. Калі аркестр перастае іграць, яго зьмяняе струнны квартэт, які іграе ўсходнія пахавальныя песьні. Каля памосту, за лаўкамі з сям'ёй і блізкімі прыяцелямі Маякоўскага — масткі, якія малююць паэту ў труне. Да канца рабочага дня жалобная чарга вырасла да 3.000 чалавек, больш чым на квартал, працягнуўшыся па вуліцы Бэрсона. Паміж рупараў, галінак ёлак, чырвоных і чорных палотнішч красаваліся лёзунгі загінуўшага паэты: «Все до самого последнего свистка я отдаю тебе — планете пролетарий»; «Не взять нас буржуевым гончим, пятилетку в четыре года, выполним, вымчим, закончим»; «Нам общим памятником будет построенный в боях социализм».

Да позьняй ночы праходзілі шматлікія чытачы і слухачы рэвалюцыйнага паэты.

* *

МАСКВА. (НАШ. КАР.). Сёньня а 8-й гадз. вечара адбылася крэмацыя цела т. Маякоўскага.

За тры дні праз клюб пісьменьнікаў прайшло звыш 100.000 чалавек. Каля труны ў ганаровай грамадзянскай варце пазьменна стаялі пісьменьнікі, артыстыя, мастакі, вучнёўства і рабочыя.

У грамадзянскай варце былі т. т. БУХАРЫН, ХАЛАТАЎ, ЛУНАЧАРСКІ, ФЭЛІКС КОН, КЕРЖАНЦАЎ, БАБЕЛЬ, СЭЙФУЛІНА І ІНШ.

Вайсковую варту несьлі чырвонаармейцы Маскоўскай пралетарскай дывізіі.

Сёньня вышаў аб'яднаны нумар «Литературной газеты» і «Комсомольской Правды», прысьвечаны Маякоўскаму.

У газэце надрукаваны артыкулы, нарысы і вершы, прысьвечаныя нябожчыку.

ТАВ. БЕЛА КУН у заметцы пад загалоўкам «Памылка, якую ня выправіш» піша:

— Маякоўскі — буйны рэвалюцыйны паэта ня толькі Савецкага Саюзу, але і міжнародны, зрабіў такую памылку. Аднак, з прычыны гэтай памылкі ня прыходзіцца забываць усіх яго заслуг перад пралетарскай рэвалюцыяй. Яго творы, якія зьявіліся сродкам барацьбы ў мэтах сацыялістычнага будаўніцтва, увойдуць ня толькі ў гісторыю літаратуры, але і ў жалезны арсэнал міжнароднай клясавай барацьбы пралетарыяту.

Камісіяй па арганізацыі пахаваньня т. Маякоўскага атрымана шмат тэлеграм з усіх канцоў СССР і заграніцы, у якіх выказваецца вялікі жаль з прычыны такой нечаканай сьмерці вялікага рэвалюцыйнага паэты.

Сёньня раніцою працягвалася прахаджэньне тысяч людзей капя труны. А 3-й гадз. дня, у дварэ клюбу, пачаўся мітынг—грамадзянская паніхіда. Выступалі т. т. ХАЛАТАЎ, ЛУНАЧАРСКІ, ад фэдэрацыі пісьменьнікаў—ФЭЙГІН, ад Массавету—ЯФІМАВА, ад ЦК ЛКСМ—ТРОЦКІ.

А 4 гадз. 45 мінут жалобная працэсія накіравалася ў крэматорыя. Усе вуліцы па шляху працэсіі былі на поўнены народам. У крэматорыі бліжэйшыя прыяцелі паэты—КІРСАНАЎ, ТРЭЦЬЦЯКОЎ і інш. прачыталі вершы, прысьвечаныя т. Маякоўскаму.

Увесь літаратурны Ленінград ушанаваў памяць Маякоўскага

ЛЕНІНГРАД, 17. 16-га красавіка ўвесь літаратурны Ленінград ушанаваў памяць Маякоўскага. У «Дома Друку», дзе адбываўся жалобны мітынг, сабраўся шматтысячны натоўп. Заля Дома Друку не магла ўмясьціць усіх жадаючых ушанаваць памяць паэты. На вуліцы, ля будынку Дома Друку адбыўся вялікі жалобны мітынг. Толькі а 11-й гадзіне ўвечары пачаўся жалобны мітынг у Доме Друку. Усе выступаўшыя таварышы адзначылі тую вялізарную страту, якую панёс пралетарыят у асобе вялікага рэвалюцыйнага паэты.

Арганізацыя працы і вытворчасьці ў калгасах

МАСКВА, 16. Закрылася скліканая НКЗ СССР і Калгасцэнтрам нарада аб арганізацыі працы і вытворчасьці ў калгасах.

Нарада рашыла, што работу паміж калгаснікамі трэба разьмяркоўваць роўнамерна, дапускаючы, аднак і разьмеркаваньне работы па ліку едакоў у сем'ях. Трэба магчыма паўней скарыстаць усіх працаздольных членаў калгасу.

Нарада прыняла асобную пастанову аб правядзеньні ўборачнай кампаніі. Яна ўхваліла пастанову НКЗ СССР і Калгасцэнтру аб пакіданьні ў індывідуальным карыстаньні калгаснікаў ураджаю азімых, засеяных да ўступленьня ў калгас. Уборка хлябоў, засеў якіх быў зроблены членам калгасу да ўступленьня ў апошні, робіцца сіламі калгасу ў агульным парадку, пры непасрэдным удзеле самога пасеўшчыка. Пры жаданьні калгаснік можа зьняць азімы ўраджай асабіста, бяручы інвэнтар у калгасе і аплачваючы яго паводле пастановы агульнага сходу. Пры адначасовым пасьпяваньні хлябоў калектыўныя пасевы ўбіраюцца раней індывідуальных. Ураджай усіх шматгадовых траў, пасеў якіх быў зроблены ў індывідуальным парадку, павінен паступаць у распараджэньне калгасу, але пры гэтым пасеўшчыку аплачваюць затраты за насеньне і яго працу. (ТАСС).

Парадак абмену пазык індустрыялізацыі на пазыку „пяцігодка — у чатыры гады“

МАСКВА. На Ўсесаюзнай нарадзе па дзяржкрэдыце тав. Б. В. Вульф зрабіў даклад аб замене трох пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сельскае гаспадаркі на пазыку «Пяцігодка — у чатыры гады». Кампаніі па абмене і па разьмяшчэньні новай пазыкі будуць праводзіцца адначасова. Кожны трымальнік аблігацый пазык індустрыялізацыі і «ЗУКХ» павінен прад'явіць свае аблігацыі да абмену ў індывідуальным парадку. Аблігацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі, яшчэ не разданыя на рукі, будуць абменьвацца ў каляктыўным парадку. У вёсцы ў індывідуальным парадку абменьваюцца абсалютна ўсе пазыкі. Калі трымальнік пазыкі зробіць абмен да 1-га студзеня 1931 году, дык ён будзе атрымліваць прыбытак бесьперапынна. З першага студзеня 1931 г. па аблігацыях пазык індустрыялізацыі і «ЗУКХ» трымальнікі ня будуць атрымліваць ні выйгрышаў, ні процантаў. Канчатковы тэрмін для абмену аблігацый пазык індустрыялізацыі «ЗУКХ» на новую пазыку мінае 1-га студзеня 1931 году.

Падпісную кампанію на новую пазыку мяркуецца пачаць у канцы або пачатку лістпена бягучага году. Пазыка выпускаецца 1-га студзеня 1931 году.

ВЫНІКІ ПРАВЕРКІ І ЧЫСТКІ САВЕЦКАГА АПАРАТУ

НА ЎСЕСАЮЗНАЙ НАРАДЗЕ СТАРШЫНЬ КАМІСІЙ ПА ПРАВЕРЦЫ І ЧЫСТЦЫ САВАПАРАТУ

МАСКВА, 16. Пры Наркамаце РСІ адкрылася Ўсесаюзная нарада старшынь камісій па праверцы і чыстцы савецкага апарату.

Чыстка дала яскравы малюнак агіднага стану ўсіх фінансавых органаў, пачынаючы з Наркамфіну Саюзу і канчаючы нізавымі фінаддзеламі.

У вынікі чысткі апарат вызваляецца ад нягодных і шкодных элемэнтаў. Сярэдні процант вычышчаных ва ўстановах 12-15 проц. у нізавым савецкім апараце. Амаль усюды важнейшым вынікам чысткі зьяўляецца спрашчэньне і скарачэньне апарату. Апарат Наркамфіну СССР скарочаны на 18 проц., Мосфінаддзел — на 50 проц., Уральская зямлякіраўніцтва — на 60 проц. і г. д.

Чыстка суправаджаецца выдучэньнем вялізнае колькасьці рабочых у савецкі апарат. Важнейшая задача ў цяперашні час — замацаваньне вынікаў чысткі шляхам садзейнічаньня вылучэнцам. Іх трэба перападрыхтаваць на рабоце. Заводы і фабрыкі павінны трымаць са сваімі вылучэнцамі самую цесную сувязь.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Недаацэнка і пасыўнасьць у рабоце сярод батрацтва і беднаты — адно з самых шкодных праяўленьняў правага апартунізму

Узмацніць барацьбу з правым ухілам — галоўнай небясьпекай і з „левымі“ загібамі, якія граюць на-руку праваму ўхілу

Іх не закранаюць дырэктывы партыі

(Аршаншчына)

Горацкая партарганізацыя, напэўна, лічыць, што яе не закранаюць дырэктывы партыі аб рабоце сярод батрацтва і беднаты, бы стап гэтае працы ў раёне інакш, як грубейшым ігнараваньнем гэтых асноўных і важнейшых дырэктыў партыі, назваць нельга.

Большасьць партыйных ячэек раённай арганізацыі наяўна недаацэньвае гэтай работы, літаральна нічога ня робячы сярод батрацтва і беднаты. Па арганізацыі гуляюць такія махрова-праваапартуністычныя «тэорыкі», як, напрыклад, заявы аб тым, што «у нас ёсьць больш сур'ёзныя справы, чым работа сярод беднаты».

У раёне ў калгасах амаль зусім няма батрацка-бядняцкіх груп. Існуючыя групы працуюць нездавальняюча. Няма пастаянных кіраўнікоў, а гэта толькі спрыяе развалу работы ў батрацка-бядняцкіх групах. Кіраўніцтва работай груп з боку партыйных ячэек у большасьці выпадкаў нікуды ня варта. Як прыклад фармальнага, бюракратычнага кіраўніцтва батрацка-бядняцкімі групамі трэба адзначыць «работу» Казіміраўскай парт'ячэйкі.

Ня лепш стаіць справа і з батрацка-бядняцкімі сходамі. Яны, як правіла, склікаюцца толькі ад выпадку да выпадку. Звычайна ў раёне батрацка-бядняцкія сходы склікаюцца толькі пасьля спэцыяльнага паказаньня з боку вышэйшых арганізацый. Ня дзіва, што батрацтва, беднота і серадняк ў значнай большасьці месц ня былі прыцягнуты да работы па калектывізацыі. Гэта, у сваю чаргу, прывяло да адміністрацыйнага насаджваньня калгасаў, з якіх значная частка аказалася «паперовымі». Асабліва дрэнна пастаўлена работа сярод батрацтва і беднаты ў Казіміраўскім, Ленінскім і Кацеляўскім сельсаветах.

Так Горацкая партарганізацыя праводзіць у жыцьцё дырэктывы партыі аб рабоце сярод батрацтва і беднаты. Да рэчы, гэтыя дырэктывы яшчэ дасюль зусім не прапрацаваны ў раённай партарганізацыі. Аршанскі акругком партыі паставіў ужо па від бюро Горацкага РК за нездавальняючую работу сярод беднаты і батрацтва. Мы лічым, што гэтага мала. Акруговы камітэт партыі павінен больш рашуча ўдарыць па тых, хто забывае, што недаацэнка і пасыўнасьць у рабоце сярод батрацтва і беднаты—гэта адно з самых шкодных праяўленьняў правага ўхілу на практыцы. К.

На выгаду клясаваму ворагу

(Круглянскі раён)

У раёне пры правядзеньні калектывізацыі былі дапушчаны агідныя скажэньні партыйнай лініі. Мясцовыя работнікі раскулачылі дзесяткі серадняку. Гэтыя злачынныя перагібы прывялі да згортваньня калгаснага руху ў раёне. Зараз процант калектывізаванай плошчы значна зьменшыўся.

Як-жа раённая арганізацыя выпраўляе дапушчаныя памылкі і ліквідуе перагібы і скажэньні партлініі ў калгасным партыйнай лініі. У радзе месц камуністыя, літаральна нічога ня робячы па выпраўленьні перагібаў, займаюцца разважаньнямі аб тым, «хто вінаваты ў перагібах і памылках...»

На раённым партсходзе і сходзе райпартактыву толькі аб гэтым і гаварылася. Пры чым, некаторыя камуністыя замест прызнаньня сваіх памылак адкрыта выступілі з паклёпніцкімі нападкамі на ЦК партыі. Гэтыя, з дазволу сказаць, партыйцы даводзілі, што «калі-б не артыкул т. Сталіна, дык з калектывізацыяй усё было-б добра». І такія антыпартыйныя, шкодныя настроі маюць месца ў радзе парт'ячэек. Апартуністычныя элемэнты раённай арганізацыі адкрыта ці ў замаскаванай форме прабуюць дыскрэдытаваць партыйнае кіраўніцтва, прабуюць атакаваць лінію партыі.

Гэтым анты-партыйным вылазкам правых і «левых» апартуністых не заўсёды дасцца сваячасовы і рашучы адпор.

Прадстаўнік акруговага камітэту партыі, які знаходзіцца ў раёне, з свайго боку даволі часта ня толькі не рэагуе на гэтыя факты, але сваімі блытанымі выступленьнямі дэзарыентуе партыйную арганізацыю. Напрыклад, прадстаўнік Аршанскага АК КП(б)Б т. Козель даў устаноўку аб тым, што зараз ня трэба выпраўляць памылак. На партыйным сходзе тав. Козель проста заявіў, што «цяпер ня трэба займацца выяўленьнем і выпраўленьнем зробленых памылак, а трэба рухацца наперад».

Гэтае шкоднае выступленьне, накіраванае супроць дырэктыў партыі аб рашучым і безадкладным выпраўленьні памылак і перагібаў, было прыхільна спаткана з боку частькі сходу.

Пастановы ЦК УсеКП(б) і артыкулы т. Сталіна прапрацаваны далёка не ва ўсіх ячэйках. Растлумачэньне гэтых пастаноў ЦК і артыкулаў т. Сталіна сярод батрацтва і бядняцка-серадняцкіх мас амаль зусім не праводзіцца.

Мы павінны сыгналізаваць аб трывожным становішчы ў Круглянскай парт арганізацыі. Частка камуністых райарганізацыі дэмабілізавалася, апусьціла рукі і не жадае выпраўляць памылак і скажэньняў партыйнай лініі. Многія партыйцы, якія ўчора дапускалі грубейшыя антысераднякоўскія скажэньні, грубейшыя «левыя» перагібы—сёньня сталі адкрытымі правымі апартуністымі. Яны зараз імкнуцца паслабіць барацьбу з кулаком, яны пачалі шкадаваць аб кулацкіх культурных гаспадарках, пачалі заяўляць, што «перабудова вёскі на сацыялістычны лад немагчыма» і інш.

Трэба проста сказаць, што гэтым правым апартуністым, а таксама і «левым» загібчыкам у радзе выпадкаў не дасцца сваячасовага адпору.

А воз і зараз там

(Меншчына)

У Халопеніцкім раёне праца сярод батрацтва і беднаты пастаўлена вельмі дрэнна. Партыйныя ячэйкі гэтай работай займаюцца ад выпадку да выпадку. Асобныя ячэйкі груба ігнаруюць дырэктывы партыі аб рабоце сярод батрацтва і беднаты, праводзячы гэтым лінію правага апартунізму на практыцы. Нядзіўна, што большасьць батрацка-бядняцкіх груп, арганізаваных у раёне, зусім не працуе. Пры сельсаветах, канцэрацыі і інш. у Халопеніцкім раёне было арганізавана 12 груп беднаты. Зараз амаль усе гэтыя групы існуюць толькі на паперы. У такім-жа становішчы знаходзяцца батрацка-бядняцкія групы пры калгасах. Афіцыйна іх налічваецца каля 19. Аднак, фактычна ні адна група не разгарнула сыстэматычнай работы. Частка калгасных бядняцка-батрацкіх груп зусім развалілася.

Сакратары некаторых ячэек заместа таго, каб разгарнуць работу сярод батрацтва і беднаты, імкнуцца апраўдаць сваю бязьдзейнасьць «аб'ектыўнымі» прычынамі. Ня прыходзіцца гаварыць, што гэтыя прычыны ня маюць пад сабою ніякіх падстаў. Многія сакратары, напрыклад, апраўдваюцца тым, што... калгасы арганізаваны нядаўна, а таму ня было магчымасьці разгарнуць работу сярод батрацка-бядняцкіх мас. Так апраўдваюцца сакратары Грыцкоўскай, Халопеніцкай, Хацюхоўскай і іншых ячэек.

Як-жа рэагуе на гэтыя факты раённы камітэт партыі. Райком толькі канстатуе ў сваіх шматлікіх пастановах адсутнасьць работы сярод батрацтва і беднаты, але ня ўжывае ніякіх рашучых і канкрэтных захадаў.

У лютым на раённым партсходзе была ўхвалена пастанова, якая падкрэсьлівала недапушчальную слабасьць работы сярод батрацка-бядняцкіх мас. Потым такая-ж пастанова была ўхвалена ў сакавіку, А ВОЗ І ЗАРАЗ ТАМ.

Усе пастановы райкому і арганізацыі па гэтым пытаньні застаюцца на паперы.

І.

Дзе няма работы з беднатой

(Магілеўшчына)

У Чырвонапольскім раёне калектывізацыя была «праведзена» ў некалькі тыдняў. У якія-небудзь месяц-паўтара раён быў «калектывізаваны на ўсе 100 проц.» Пры тым, мясцовыя работнікі ня лічылі патрэбным праводзіць адпаведнай агітацыйна-растлумачальнай і арганізатарскай работы сярод батрацка-бядняцкіх мас. Ніякай папярэдняй работы сярод батрацтва і беднаты зусім не праводзілася. Раённыя і сельскія работнікі абмежаваліся толькі тым, што склікалі ў кожнай вёсцы сход, прысьвечаны арганізацыі калгасу. На сходах пытаньне аб калектывізацыі ставілася проста. Усім бедняком і серадняком, якія не жадалі ўступіць у калгасы, мясцовыя работнікі заяўлялі:

«Калі вы ня ўступіце ў калгасы, дык не атрымаеце зямлі ня толькі ў Чырвонапольскім раёне, але і ва ўсёй Магілеўшчыне...»

Здавалася-б, што Чырвонапольская арганізацыя павінна была рашуча ўзяцца за выпраўленьне дапушчаных перагібаў і скажэньняў партыйнай лініі. Аднак, прыходзіцца канстатаваць, што дапушчаныя памылкі выпраўляюцца недапушчальна марудным тэмпамі. Большасьць партыйных ячэек, як і раней, не праводзіць ніякай работы сярод батрацтва і беднаты. З гэтымі адрацкімі правямі праваапартуністычнага ўхілу на практыцы не вядзецца рашучай барацьбы. Характэрна, што партыйныя ячэйкі нават не прапрацавалі артыкулу тав. Сталіна і пастановы ЦК УсеКП(б). Аб растлумачэньні гэтых важнейшых палітычных дакумантаў батрацка-бядняцкім масам гаварыць ня прыходзіцца. Ні артыкул т. Сталіна, ні пастановы ЦК, ні новы статут с.-г. арцелі ня былі сваячасова растлумачаны беднаце і серадняцтву.

Толькі зараз асобныя ячэйкі сёе-тое робяць у гэтым напрамку. Частка-ж ячэек і на сёнешні дзень бязьдзейнічае і ня выпраўляе сваіх памылак.

А. Р.

ДА ЎВАГІ ЎСІХ ЧЛЕНАЎ ПАРТЫІ, ЧЛЕНАЎ ЛКСМБ, РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ!

У чэрвені адкрываецца

16-ы ЎСЕСАЮЗНЫ ПАРТЫЙНЫ ЗЬЕЗД.

Практыка папярэдніх зьездаў паказала, што прадзьездаўская работа пачынае разгортвацца на старонках „ПРАВДЫ“ значна раней адкрыцьця зьезду.

Попыт на „ПРАВДУ“ штодзенна пачынае ўзрастаць, у сувязі з чым выдавецтву неабходна загадзя загатовіць адпаведную колькасьць паперы для таго, каб поўнасьцю і сваячасова ўсіх задаволіць газэтай.

Беларускае аддзяленьне выдавецтва ЦК УсеКП(б) „ПРАВДА“, улічваючы гэту вельмі важную абставіну і жадаючы задаволіць газэтай „Правда“ ўсіх партыйцаў, камсамольцаў і беспартыйных рабочых і служачых, просіць пакпапаціцца выпіскай „Правды“ з падпіскі на май месяц на больш доўгі тэрмін.

МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 31, тэл. №№ 8-21 і 7-03. Беларускае аддзяленьне выдавецтва ЦК УсеКП(б) „ПРАВДА“

Баявая задача партарганізацый—пераключыцца на новыя мэтады культурна-масавага абслугоўваньня рабочых

Перабудаваліся

«Прамфінплян—у масы», «усю работу—у цэх»—вось лёзунгі, пад якімі праводзіцца масавая работа ў Менскай Дзярждрукарні імя Сталіна.

Друкарня мае вялікую практыку масавай работы. Калі раней абедзеныя перапынкі зусім не выкарыстоўваліся, дык зараз, каб рабочы атрымаў разумны, карысны ў гэты час адпачынак—праводзяцца гутаркі, лекцыі, даклады, канцэрты.

Па ўсіх пытаньнях, як падрыхтоўка да чысткі партыі, дасягненьні ў вытворчасьці, праверка сацыялістычнага спаборніцтва—наладжваюцца вытворчыя цэхавыя вечары. Гэта дае магчымасьць прыцягнуць да работы і жонак рабочых. Часта такія вечары наладжваюцца за шклянкай гарбаты.

Да гадавіны сацспаборніцтва былі праведзены цэхавыя вытворчыя вечары. Гэтыя вечары мабілізавалі ўвагу рабочых па выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. На гэтых вечарох наладжваліся палітрулеткі. Тым, хто лепш адказваў на запытаньні, выдаваліся падарункі. Загадзя былі абвешчаны пытаньні, на якія трэба адказваць. Гэта дало магчымасьць рабочым падрыхтавацца. Тут-жа былі наладжаны вытворчыя выстаўкі, дзе паказваліся прыклады дрэннай і добрай якасьці прадукцыі, дыяграмы выкананьня прамфінпляну.

Цэхавыя вечары далі свае станоўчыя вынікі. Калі ў 1-м квартале прамфінплян быў выкананы на 101,2%, дык у 2-м квартале ён выкананы на 104,6 проц. Па наборным цэху за 1-шы квартал прамфінплян быў выкананы на 88,4 проц., у другім-жа квартале—на 92,8

Дзякуючы добрай пастаноўцы масавай работы прыліў рабочых у партыю значна павялічыўся. У Ленінскія дні звыш 30 рабочых прынята ў рады партыі. Матынны цэх абвясьціў сябе камуністычным. Вынікі работы камуністычнага цэху наступныя: у першым квартале прамфінплян быў выкана на 110.2 проц. у другім-жа—на 116,4 проц.

Разгорнута работа па ахопе партыйнай чобаю нова-ўступіўшых у партыю. При парткалектыве створана 5 сэктароў, при цэх'ячэйках—па 3-4 сэктары—гэта дае магчымасьць палепшыць кіраўніцтва ўсёй культмасавай работай па прадпрыемстве.

Добры пачын зрабіла камсамольская ячэйка наборнага цэху. З мэтай наблюдзеньня прамфінпляну да кожнага работача, ячэйка друкуе план асобным лістком, каб раздаць яго ўсім рабочым для азнаямленьня. Пасьля гэтага будзе праведзена рад гутарак-абгаварэньняў, наладжана палітрулетка на пытаньні прамфінпляну і пяцігодкі.

Да недахопаў трэба аднесьці адсутнасьць культурна-масавай работы сярод рабочых, занятых у 2-й і 3-й зьменах. Перапынак не скарыстоўваецца. Рабочыя 2-й і 3-й зьмены зусім адарваны ад агульнага жыцьця друкарні. Члены бюро парткалектыву ці працаўнікі фаб заўмясцкому рэдка заглядаюць у цэх у начныя часы. Прадсьцыпліна сярод начных рабочых не на належнай вышыні.

Начныя рабочыя не павінны заставацца без культурна-масавага абслугоўваньня. На гэты бок работы парткалектыву трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу.

І. Р—н.

Культмасавую работу—у цэх

За апошні час надзвычай мала аддаецца ўвагі пастаноўцы культурна-масавай работы на прадпрыемствах і асабліва ў цэху. Па большасьці саюзаў абследваньнем стану прафпрацы канстатуецца, што культурна-асьветныя ўстановы, культурна-масавая праца не адбіваюць чарговых задач рэканструкцыйнага пэрыяду, што вельмі рэдка праз культурна-масавую працу сярод рабочых папулярызуюцца чарговыя задачы, якія стаяць перад рабочай клясай. Вельмі рэдка сустрэнеш на прадпрыемстве і асабліва ў цэху, каб там праз разгортваньне культурна-масавай працы растлумачвалася рабочым, як выконваецца прамфінплян, як ідзе сад. спаборніцтва і г. д. Спадзяюцца, што гэтыя пытаньні асьвятляюцца ў клюбах.

Той, хто думае пасьпяхова выканаць і перавыканаць прамфінплян, не наладзіўшы культурна-масавую работу ў цэху, зьмене і ў цэлым на прадпрыемстве, той «глыбока памыляецца. Вельмі цяжка будзе выконваць прамфінплян, калі масава рабочых ня будзе ведаць, як пабудаваны прамфінплян, якія задачы стаяць перад рабочай клясай у рэканструкцыі сацыялістычнай гаспадаркі і наадварот, лёгка будзе дасягнуць добрых посьпехаў, калі сапраўды будзе наладжана культурна-масавая работа.

Ужо ня раз адзначалася, што важнейшыя дырэктывы партыі, як: пастанова ЦК УсеКП(б) аб адзіначальлі, адозва ЦК УсеКП(б) ад 25 студзеня 1930 г. і інш., вельмі слаба прапрацаваны сярод рабочых. У многіх мясцох абмежаваліся абгаварэньнем гэтых дырэктыў толькі на агульных сходах, а калі ўлічыць, што агульныя сходы яшчэ наведваюць ня ўсе рабочыя, ды зразумела, што значная частка рабочых нават і ня ведае пра гэтыя дырэктывы.

За апошні час значная частка прадпрыемстваў працуе ў 3 зьмены., але культурна-масавая праца зусім не прастасавана да абслугоўваньня начных зьмен. Чамусьці лічаць, што на начных зьменах немагчыма праводзіць растлумачальную працу, забываючыся, што рабочы прапрацаваўшы на начной зьмене не заўсёды мае магчымасьць дзень наведаць культурна-асьветную ўстанову. Трэба пабудаваць культурна-масаву працу так, каб ёю ахапіць ня толькі дзённыя зьмены, а таксама і начныя—праца чырвонага кутку, гутарка, чытка газэт і інш. павінны праводзіцца ў кожнай зьмене.

Значная частка прадпрыемстваў працуе на бесьперапынцы, але-ж яшчэ часта сустракаемся з тым, што культурна-масавая праца не прыстасоўваецца і бесьперапынкі, чамусьці стараюцца праводзіць масавыя вечары па-старынцы (субота, нядзеля),—зусім рэдка дзе на прадпрыемства можна сустрэць, каб фабрычна- заводзкія арганізацыі, распрацоўваючы плян культурна-масавай працы ўлічвалі неабходнасьць абслугоўваньня паасобных груп рабочых, выходзячы пяцідзённукі.

Усё гэта гаворыць аб тым, што і завы партарганізацыі і прафарганізацыі ня улічваюць усіх важнасьці культурна-масавай працы на прадпрыемствах. Трэба зараз-жа, і ў першую чаргу партарганізацыям, прыняць рад заходаў да палепшаньня культурна-масавай працы на прадпрыемствах.

Агляд польскага друку

Разгорнутая за апошнія месяцы шалёная кампанія супроць Савецкага Саюзу ва ўсім капіталістычным сьвеце з надзвычайнай вострасьцю падкрэсьлівае нарастаючую небясьпеку вайны. Выступленьне рымскага папы, спробы акружыць нас кольцам фінансава - эканамічнай блёкады, спробы сарваць наш экспарт, правакацыйныя паводзіны французкага ўраду ў самыя апошнія дні ў справе падробшчыка фальшывых вэксалёў Савелія Літвінава, стварэньне ў Польшчы габінэту Славэка і г. д. — усё гэта факты, якія ідуць па адной лініі — лініі ўзрастаючай ваеннай небясьпекі.

Апошнія выступленьні Рамана Дмоўскага на старонках польскага друку, вра біўшыя там уражаньне «выбухнуўшай бомбы», ..чэ раз далі надзвычай яскравы матар'ял аб плянах антысавецкай вайны, якая падрыхтоўваецца сусьветнай буржуазіяй, у тым ліку і фашысцкім урадам Польшчы. Мы ня будзем тут падаваць гэтых выступленьняў Дмоўскага, бо наша прэса з належнай поўнасьцю адзначала іх.

Раман Дмоўскі — заснавальнік, ідэалёг і лідэр правай польскай партыі нацыянал-дэмакратаў (эндэкаў), якія зьяўляюцца часткаю польскага фашызму. Таму наіўна і памылкова было-б бачыць у Дмоўскім і эндэках пацыфістых, якія стаяць на варце міру ва Ўсходняй Эўропе. Эндэкі—архірэакцыйная партыя, якая абараняе інтарэсы буйнога польскага капітала і якая абапіраецца на найбольш адсталыя пласты дробнае буржуазіі—ня раз давалі волю сваёй нянавісьці да першай у сьвеце пралетарскай дзяржавы. У замежнай палітыцы эндэкі прытрымліваюцца традыцыйнай французкай арыентацыі і калі-б яны прыйшлі да ўлады, дык антысавецкая палітыка французкага імпэрыялізму напэўна знайшла-б у іх аблічы паслухмяную зброю.

Цяперашняе выступленьне Дмоўскага супроць уздену Польшчы ў антысавецкім ваенным выступленьні прадыктавана рэдкім меркаваньняў, сярод якіх галоўную ролю адыгрываюць — гэта меркаваньні ўнутранай палітыкі.

Водгукі польскага друку на выступленьні Дмоўскага прадстаўляюць для нас бязумоўна вялікую палітычную цікавасьць. Яны яшчэ раз цалкам пацьвярджаюць усе нашы заявы аб узрастаючых ваенных падрыхтаваньнях з боку польскіх імпэрыялістых да антысавецкай вайны.

«Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны» — добра інфармаваная і блізкая да ўраду кракаўская газэта друкуе 13 красавіка вялікі артыкул пад вельмі характарным загалоўкам «Хворая і раззлаваная Эўропа. Чырвоная пляма на целе Эўропы». «Чырвоная пляма» — гэта Савецкі Саюз, само існаваньне якога не дае спакою сусьветнай буржуазіі. Наш рост, нашы посьпехі, наша пяцігодка, якая прымушае «сусьветных коміваяжэраў» паскорыць выкананьне сваіх плянаў антысавецкае вайны — усё гэта моманты, якія штурхаюць «хворую Эўропу» да крывавай барацьбы з Савецкім Саюзам.

«Ілюстраваны Кур'ер» піша:

«Старая Эў

НАПЯРЭДАДНІ ГАДАВІНЫ САЦСПАБОРНІЦТВА

Не марудзіць з пачаткам самаправеркі

На заводзе „Дрэваапрацоўшчык", абутковай фабрыцы, чыгуначных майстэрнях—самаправерка пад пагрозай зрыву

ПРЭЗЫДЫУМ ЦСПСБ ПРАПАНУЕ ЎЗМАЦНІЦЬ ТЭМПЫ ПАДРЫХТОЎКІ

Гэтымі днямі пры ЦСПСБ адбылася нарада брыгадзіраў, якія вылучаны для ўдзелу ў праверцы выкананьня прамфінпляну і сацдагавароў на заводзе „Дрэваапрацоўшчык", абутковай фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна», у удзелам інжынерна - тэхнічных работнікаў. Былі заслуханы кароткія інфармацыі брыгадзіраў і прадстаўнікоў цэнтральных праўленьняў саюзаў аб ходзе самаправеркі.

Выявілася, што на большасьці прадпрыемстваў самаправерка яшчэ не пачалася. На некаторых прадпрыемствах нават яшчэ не пачалася падрыхтоўка да самаправеркі. Асабліва дрэнная справа на заводзе «Дрэваапрацоўшчык», дзе заўком не ўсьвядоміў задач самаправеркі і таму не пачынае падрыхтоўкі, на абутковай фабрыцы, дзе падрыхтоўка да праверкі пачалася толькі гэтымі днямі, і ў чыгуначных майстэрнях, дзе мясцовыя арганізацыі праяўляюць нячуваны канцэрватызм у гэтай справе.

Цэнтральныя праўленьні саюзаў у большасьці выпадкаў абмежаваліся пасылкай дырэктыўных лістоў і ня цікавяцца ходам падрыхтоўкі. Напрыклад, Менскі вучкрафсобраз, паколькі стаіць пытаньне аб яго ліквідацыі, парашыў, нічога не чакаючы, «самаліквідавацца». Бюро чыгуначнікаў апраўдваецца адсутнасьцю работнікаў. І сапраўды, там уся работа ўзвалена на аднаго работніка-вылучэнца.

На заводзе «Камунар» ужо арганізаваны праверачныя брыгады. На «Энэргіі» ідзе вярбоўка добраахвотнікаў. На гуце «Пралетары», паводле паведамленьня прадстаўніка саюзу хэмікаў, работа толькі пачынаецца. На швэйнай фабрыцы «Кастрычнік» падрыхтоўка пачалася дзён тры таму назад. На фабрыцы «Беларуска» арганізаваны ўдарныя брыгады для самаправеркі па цэхах. Праводзены конкурс на лепшае тэхнічнае ўдасканаленьне. Але і тут, паводле паведамленьня прадстаўніка саюзу дрэваапрацоўшчыкаў, работа праходзіць ня зусім добра, няма ў ёй масавасьці. На гарбарні «Бальшавік» падрыхтоўка пачалася з 3-га красавіка, але праверка выкананьня прамфінпляну і сацдагавароў пачалася гэтымі днямі.

Больш-менш добра ідзе самаправерка на саюзе друкароў. У друкарні БДВ самаправерка ўжо канчаецца. Высьветлілася, што многія ўдарныя групы і нават цэхі існавалі толькі на паперы.

УЦЯГНУЦЬ ШЫРОКІЯ МАСЫ!

Пры Гомельскім акрпрафбюро адбылася нарада, прысьвечаная падрыхтоўцы да самаправеркі выкананьня прамфінпляну і сацдагавароў. З інфармацыі прадстаўнікоў фабзаўкомаў заводаў «Пралетары», імя Ланцуцкага, «Калектыўная Праца», фабрык «Ввзуві», «Камінтэрн» і друкарні «Палесдруку» выявілася, што падрыхтоўка да самаправеркі разгортваецца вельмі павольна. Нарада адзначыла, што хаця вярбоўка добраахвотнікаў набыла шырокія размеры, але з прычыны невыстарчальнага кіраўніцтва добраахвотнікамі, якасьць іх работы нездавальняючая. У рабоце добраахвотных брыгад наглядаецца нейкая замкнутасьць і слабая сувязь з шырокімі рабочымі масамі ў працэсе самаправеркі. Напрыклад, на швэйнай фабрыцы «Камінтэрн» самаправерка ужо лічылася скончанай, між тым, нарада адзначыла ў самаправерцы рад недахопаў. Фабкому прапанавана неадкладна разгарнуць работу часовых кантрольных камісій і добраахвотных брыгад, падагуліць усё зробленае і прадставіць матар'ял агульна-фабрычнай канфэрэнцыі.

Нарада таксама адзначыла, што клюбы ніякага ўдзелу ў самаправерцы ня прымаюць. Клюбам прапанавана шляхам правядзеньня вечароў пытаньняў і адказаў, шляхам пастановы паказальных судоў над ілжэ-ударнікамі і г. д. дапамагчы прадпрыемствам лепш правесьці самаправерку. Усе мастацкія гурткі павінны быць прыцягнуты для абслугоўваньня самаправеркі.

У бліжэйшыя дні ў Гомелі наладжваецца рад радыё-пераклічак паміж прадпрыемствамі. Ж.

„У нас шмат кампаній, больш ня хочам"

Брыгада ЦСПСБ і акругкому камсамолу, якая паслана на цьвіковы завод «Чырвоны Кастрычнік» (Варань, Арханскае акругі) спаткала шмат трудасьцяй. Замест належнай дапамогі з боку бюро парт'ячэйкі і асобных партыйцаў, апошнія толькі і робяць, што ныюць: «у нас столькі кампаній, столькі кампаній — і засэўная, і агітацыя, і агляд рабочай кампэрацыі, і перавыбары заўкомаў... А цяпер ідуць перавыбары цэхавых парт'ячэек. Таму мы ніяк ня можам прыняць удзелу ў праверцы прамфінпляну і сацдагавору».

І бюро парт'ячэйкі ня можа ўцямініць, што можна лёгка ўвязаць перавыбары цэхавых парт'ячэек з самаправеркай. Тым больш, што на партыйных сходах выяўлялася шмат вытворчых недахопаў.

Напрыклад, на пераабсталяваньне заводу адпушчана поўмільёна рублёў, складзены ўжо пляны і каштарысы пераабсталяваньня, а рабочая маса не інфармавана аб плянах перабудаваньня заводу.

Па некаторых цэхах наглядаюцца вялікія прастоі. З прычыны патрэбнасьці дробнага рамонту, адзін варштат прастаяў тры дні. Шмат недахопаў у нова-тэхсавым цэху. Напрыклад, падаюць дрэнная якасьці дрот, які зьмяшае выхад прадукцыі. Не хапае кваліфікаваных сельсараў. Заводзкія сьлесары слаба тэхнічна падрыхтаваны.

І вось гэтыя пытаньні і трэ' было ўвязаць з перавыбарамі цэхавых парт'ячэек. Між тым, бюро парткалектыву падлічвае кампаніі і захапляецца іх колькасьцю. Таму вярбоўка добраахвотнікаў у самаправерачныя брыгады ідзе міма камуністых заводу.

Брыгадзіры ЦСПСБ і АК ЛКСМ КАЙКОЎ і ВАСІЛЁНАК.

Дрэнны пачын на другое паўгодзьдзе

Швэйная фабрыкі, за выключэньнем менскай фабрыкі «Кастрычнік», якая за першую дэкаду перавыкапала вытворчую праграму на 5,8 проц., другое паўгодзьдзе пачынаюць з правалаў.

Гомельская фабрыка «Камінтэрн» выканала вытворчую праграму за 10 дзён на 92,1 проц., віцебская ф-ка «Прафінтэрн» — на 88,3 проц. і магілеўская фабрыка імя Валадарскага — на 79,1 проц.

На запытаньне трэсту аб прычынах недавыкананьня праграмы, адміністрацыя фабрыкі імя Валадарскага паведаміла, што ў іх была затрымка з «ушожкай» на 1.000 адзінак і napасіла трэст прыслаць двух чалавек.

Прамфінплян да варштату не даведзены

На Бабруйскай гуце «Камінтэрн» пытаньне аб самаправерцы абмяркоўвалася на зьменных сходах рабочых, партыйных сходах і на сходзе членаў клюбу. Выбраны (?) брыгады ў ліку 50 чалавек з усіх зьмен і членаў клюбу. Брыгады праінструктаваны. Кожная брыгада разьбіта на групах. Брыгадзірам выданы інструкцыі па праверцы. На пасяджэньні заўкому заслуханы інфармацыі зьменавых прафупоўнаважаных аб ходзе праверкі.

Тры зьменавыя брыгады праверку пачалі ўжо. Ёсьць ужо канкрэтныя вынікі. Выяўлен рад недахопаў. Напрыклад, у пераборачным цэху брак не правяраецца, у ім часта знаходзяць добраякасныя бутэлькі. У кузьні і машынным аддзяленьні некаторыя рабочыя заявілі, што яны ня ведаюць аб сваіх абавязках па сацдагаворы. Камсамольскі калектыў, пасьля таго, як уліўся ў агульна - рабочыя брыгады, паслабіў работу з ударнікамі. Прамфінплян пакуль што даведзены толькі да зьмены і яшчэ не даведзены да кожнага варштату.

Частка адміністрацыйна - тэхнічнага персаналу адносіцца да самаправеркі з халадком.

Брыгадзір акрпрафбюро МЭЕР.

АД РЭДАКЦЫІ: Калі паказаньне аб тым, што самаправерачныя брыгады на заводзе «Камінтэрн» выбіраліся, не выяўляецца памылкай аўтара, трэба заўважыць, што на заводзе не зразумелі новых форм і мэтадаў работы, якія, у прыватнасьці, выяўляюцца ў вярбоўцы добраахвотнікаў для правядзеньня самаправеркі.

На „Энэргіі" самаправерка яшчэ не пачалася

Падрыхтоўчая работа да праверкі выкананьня прамфінпляну і сацдагавароў на заводзе „Энэргія" ідзе павольна. З 1.100 рабочых для ўдзелу ў праверцы запісалася 100 добраахвотнікаў, з іх каля 30 камуністых і камсамольцаў. Але трэба сказаць, што такі лік добраахвотнікаў усё-ж кажа аб невыстарчальнай зацікаўленасьці заводзкіх арганізацый самаправеркай і слабой растлумачальнай работай.

Часовая кантрольная камісія работу яшчэ не разгарнула.

Брыгадзіры „Зьвязды"

Брайнік і Зэвін.

Рабкоры—у першыя рады барацьбы за прамфінплян

Агульны сход рабкораў фанэрнага цэху Бабруйскага камбінату прыняў выклік рабкораў фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» і абвясьціў сябе ўдарным па правядзеньні самаправеркі выкананьня прамфінпляну, сацспаборніцтва, ударніцтва і месячніка барацьбы са стратамі.

Адзначыўшы недавыкананьне прамфінпляну ў частцы зьніжэньня сабекошту і якасьці прадукцыі, рабкоры абавязаліся дапамагчы калектыву камбінату ў ліквідацыі прарыву.

СХОД ВЫЛУЧЫЎ УДАРНУЮ РАБКОРАЎСКУЮ БРЫГАДУ «ЗЬВЯЗДЫ» ДЛЯ АСЬВЯТЛЕНЬНЯ НА СТАРОНКАХ «ЗЬВЯЗДЫ» І АГУЛЬНА-ЗАВОДЗКАЙ ГАЗЭТЫ ЖЫЦЬЦЯ І РАБОТЫ ЦЭХУ.

На камбінаце ўжо створана 21 брыгада па самаправерцы, выбрана часовая кантрольная камісія. Брыгады пачалі праверку.

А. М.

Супроць кругавое парукі

Рабочыя заводу „Праца" і служачыя Гомельскага райсаюзу пасылаюць дэлегацыю ў Белкаапсаюз

У сувязі з матар'ялами ў «Зьвязьдзе» ад 14-га красавіка аб праверцы работы апарату Белкаапсаюзу і кругавой паруцы, якая выявілася ў часе праверкі з боку работнікаў Белкаапсаюзу, рабочыя заводу «Праца» ў Гомелі, якія прымаюць удзел у праверцы работы райсаюзу, а таксама служачыя райсаюзу, адзначаючы з абурэньнем асобныя выпадкі змазаваньня хваравітых зьявішч у апараце БКС, пастанавілі ПАСЛАЦЬ У МЕНСК ДЭЛЕГАЦЫЮ для азнаямленьня са станоўішчам на месцы.

АГЛЯД ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ

ДАКЛАД БЕЛАРУСКАЙ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ НА ЎСЕСАЮЗНЫМ РАДЫЁ-МІТЫНГУ

БЕЛКААПСАЮЗ І БЕЛКАЛГАСЦЭНТР САРВАЛІ АРГАНІЗАЦЫЮ ХАРЧАВАНЬНЯ КАЛГАСЬНІКАЎ НА ПАЛЯВЫХ РАБОТАХ

Агляд грамадзкага харчаваньня працягнуты да 1-га чэрвеня

ПАПЯРЭДНІЯ ВЫНІКІ АГЛЯДУ

17-га красавіка «Правдой» арганізаваны Ўсесаюзны радыё - мітынг, прысьвечаны аглядзу грамадзкага харчаваньня.

Гэты радыё - мітынг — першае падагульваньне вынікаў аб ходзе агляду па ўсім Савецкім Саюзе. Цэнтральная камісія па аглядзе грамадзкага харчаваньня ў БССР таксама падагуліла папярэдні вынік свае работы, з якім уключылася ў радыё - мітынг.

Агляд у Беларусі пачаўся 18 сакавіка (з нязначным спазьненьнем). Папярэдне была праведзена падрыхтоўча-прапагандысцкая работа. Былі выпушчаны лёзунгі, лістоўкі, памяткі ўдзельніку агляду, апытальныя лісты. Праведзены рад нарад рабкораў, рэдкалегій, насьценных газэт, прадстаўнікоў цэнтральнай прэсы, прафэсыянальных, кааперацыйных і гаспадарчых арганізацый па пытаньні аб арганізацыі агляду. Белдзяржкіно заказаны спэцыяльны культурфільм, які адлюстроўвае стан і пэрспэктывы грамадзкага харчаваньня.

У сучасны момант аглядам ахоплены ўсе округі і частка буйных раёнаў БССР. Ня гледзячы на тое, што кіруючыя арганізацыі (ЦК, ЦКК, ЦСПСБ і інш.) далі мясцом рад канкрэтных дырэктыў аб удзеле ў аглядзе, яшчэ па сёпешні дзень выстарчальнага пералому з боку прафсаюзаў да агляду няма. Нізавыя ячэйкі работай камісій і рабочых брыгад ня кіруюць, адносяцца да працы паказённаму.

Як выяўляецца, становішча грамадзкага харчаваньня пенскае. Сетка сталовых па Беларусі невыстарчальная,ахоп лівае яна нязначную частку рабочага насельніцтва. Калі ў Менску грамадзкім харчаваньнем абслугоўваецца толькі 10 процантаў працоўных, дык у акруговых гарадох гэты процант значна ніжэй. Сталовыя перагружаны, не абсталяваны, брудныя і няпрытульныя. Якасьць абедаў дрэнная, цэны дарагія. Адносіны да спажыўца агідныя.

Асабліва кепска стаіць справа ў сталоўках пры фабрыках і заводах.

У мэтах паляпшэньня якасьці і абслугоўваньня склікаюцца агульна - грамадзкія канфэрэнцыі кухароў і абслугоўваючага пэрсаналу.

У парадку агляду па ўсіх гарадох БССР разгортваецца будаўніцтва новых устаноў грамадзкага харчаваньня. У Менску, апрача новай фабрыкі - кухні, ў гэтым годзе будзе пабудавана да 20-ці новых сталовых, якія абслужаць яшчэ 17.500 чалавек, г. зн. павялічаць абслугоўваньне спажыўца на 200 проц. У Гомелі будуецца фабрыка - кухня, сталовая - разьмеркавальнік і рад сталовых у рабочых раёнах. Тое-ж самае ў Магілеве.

Але ёсьць пагроза зрыву гэтага будаўніцтва з прычыны поўнай адсутнасьці абсталяваньня і ВСНГБ да сёпешняга дня нічога не зрабіў у гэтай галіне.

Ня гледзячы на рад сыгналаў «Зьвязды» і на спэцыяльную пастанову прэзыдыуму ЦСПСБ і рад мерапрыемстваў цэнтральнай аглядавай камісіі, арганізацыя сталовых і перасоўных кухань у калгасах да веснавой сяўбы—Белкалгасцэнтрам і Белкаапсаюзам сарвана.

Цэнтральная і акруговыя камісіі па аглядзе выдуць улік прапаноў рабочых брыгад па паляпшэньні грамадзкага харчаваньня і, пры падтрыманьні шырокіх рабочых мас і грамадзкасьці, будуць кантраляваць пры правядзеньні іх у жыцьцё.

З прычыны выяўленых сур'ёзных недахопаў у справе грамадзкага харчаваньня, агляд на БССР будзе прадоўжаны да канца мая месяца.

А. С.

Плян забесьпячэньня харчаваньнем калгасьнікаў сарваны

Слова за ЦКК-РСІ

«Зьвязда» ўжо некалькі раз сыгналізавала аб тым, што Белкалгасцэнтр, Белкаапсаюз і Белсельтрэст зрываюць забесьпячэньне грамадзкім харчаваньнем калгасьнікаў, у часе выхаду іх на палявыя работы.

У вызначаным раней пляне Белкаапсаюз меркаваў арганізаваць на вучасткох палявых работ 400 перасовачных кухань-ачагоў і 200 сталовых. Зараз Белкаапсаюз ад выкананьня гэтага пляну адмаўляецца з прычыны яго нежыцьцёвасьці.

У большасьці раёнаў палявыя работы пачаліся ўжо. Дагэтуль ні ў адным калгасе ніводнага перасовачнага ачага-кухні няма. А наадварот, ёсьць факты развалу тых сталовак, якія былі адкрыты ў мінулым годзе (камуна імя Карла Маркса ў Магілеўскай акрузе).

Сотні тысяч рублёў, якія вызначаны на арганізацыю грамадзкага харчаваньня ў калгасах і саўгасах, застаюцца нявыкарыстанымі. Толькі адзін Цэнтрасаюз на гэту мэту адпусьціў 339.000 рублёў.

Гэты агідны вынік атрымаўся таму, што Белкаапсаюз і Белкалгасцэнтр, замест практычнай работы, займаюцца спрэчкамі аб тым — «хто павінен быць гаспдаром гэтае справы — калгасы, ці спажывецкая кааперацыя».

Пытаньне аб палявых ачагох-кухнях на працягу месяца марынавалася ў кааперацыйнай сэкцыі Дзяржпляну, потым абгаворвался ў прэзыдыуме Дзяржпляну, Эканомнарадзе і іншых інстанцыях. І пасьля такога тэрміну прэзыдыум Дзяржпляну адзначыў, «што Белкаапсаюз склаў свой плян арганізацыі сталовак без належнага ўгрунтаваньня, што ён не дае магчымасьці вызначыць колькасьці і характару будаўніцтва».

Такім чынам, з-за цяганіны, недагаворанасьці паміж Белкаапсаюзам і Белкалгасцэнтрам, справа забесьпячэньня харчаваньнем калгасьнікаў на палявых работах сарвана.

«Зьвязда» і прэзыдыум ЦСПСБ ужо зварачаліся да ЦКК-РСІ аб хуткім расьсьледваньні гэтае справы і прыцягненьні вінаватых да суровай адказнасьці. Мы яшчэ раз настойліва просім, каб, пакуль яшчэ ёсьць час, была створана магчымасьць не дапусьціць зрыву гэтае справы.

М. К.

Неабдуманае, скарасьпелае рашэньне...

Або дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва паміж Гомелем і Віцебскам

5-га красавіка Гомельская і Віцебская акруговыя камісіі заключылі паміж сабою дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве на лепшае правядзеньне агляду грамадзкага харчаваньня. Дагаворам ахоплена 40 вельмі сур'ёзных і адказных пунктаў - абавязацельстваў. Канчаецца дагавор тым, што ў першых числах мая прадстаўнік Віцебскай камісіі выяжджае ў Гомель для праверкі выкананьня ўсіх пунктаў. Дагавор апублікаваны ў Віцебскім Пралетарыем».

Узьнікае пытаньне, ці магчыма ў такі кароткі тэрмін ажыцьцявіць усё прадбачанае ў дагаворы? Ствараецца зусім ясная небясьпека, што з выкананьнем дагавору з прычыны кароткасьці тэрміну будуць сьпяшацца і ўся справа сацыялістычнага спаборніцтва будзе скамечана.

Каб не дыскрэдытаваць ідэі сацыялістычнага спаборніцтва, ідэі агляду, каб не абанкруціцца ў вачох грамадзкасьці, трэба было раней чым заключыць дагавор і публікаваць яго ў друку, — аснову ўсіх узятых на сябе абавязацельстваў абмяркаваць на шырокім рабочым актыве, забясьпечыць яго падтрыманьне. Трэба было сур'ёзна прадумаць пытаньне аб тэрміне ажыцьцяўленьня. Трэба было забясьпечыць поўнае падтрыманьне з боку ўсіх арганізацый і толькі пасьля такой падрыхтоўкі заключаць дагавор.

Не забясьпечыўшы падтрыманьня шырокага рабочага актыву, не правёўшы дастатковай падрыхтоўкі, дагавор будзе казённай, ведамасьцьвенай дэкларацыяй дзьвёх акруговых камісій і ажыцьцяўленьне яго загадзя асуджана на няўдачу.

Мы поўнасьцю ўхваляем ідэю Гомелю і Віцебску аб сацспаборніцтве. «Зьвязда» яшчэ ў пачатку агляду высоўвала пытаньне аб пераводзе агляду на рэйкі сацыялістычнага спаборніцтва. Але мы перасьцерагаем ад скарасьпелых, непрадуманых пастаноў, якія загадзя асуджаюць сур'ёзную справу на правал.

Ня гледзячы на тое, што дагавор ужо апублікаваны, Гомельская і Віцебская камісіі па аглядзе павінны неадкладна вынесьці яго на абгаварэньне шырокага рабочага актыву, неадкладна пераглядзець пытаньне аб тэрмінах і праверку рабіць не адзінкавым выездам аднаго прадстаўніка, а штодзённа абменьвацца весткамі аб ходзе агляду і аб дасягнутых вынках.

«Віцебскі Пралетары» і «Полесская Правда» павінны шырока асьвятляць гэтыя матар'ялы на сваіх старонках так, каб працоўныя Віцебшчыны ведалі, што робіцца ў Гомелі і наадварот.

Пры такіх умовах мы ўпэўнены, што абавязацельствы, якія ўзялі на сябе Гомель і Віцебск, будуць выкананы і знойдуць сабе пераймальнікаў.

СПЛАЎ

Плытагоны не забясьпечаны прадуктамі і спэцвопраткай

Няма культурнага і мэдычнага абслугоўваньня сплаўных пунктаў

На Мазыршчыне да сплаву не падрыхтаваліся

У падрыхтоўчай да сплаву рабоце на Мазыршчыне шмат недахопаў. Да апошняга часу не прапрацаваны каляндарны плян работы. Прадстаўнік ЦП сельска - гаспадарчых рабочых т. Заяц, які прыехаў у Мазыр, за 2 месяцы сваёй работы нічога канкрэтнага не зрабіў.

Акругком ЛКСМБ мабілізаваў для сплаўных работ 800 камсамольцаў, але праверкі выкананьня работы ніхто не праводзіў. Толькі тады, як крануўся лёд, Лесбел успамянуў пра сплаўныя работы і заняўся арганізацыяй курсаў для сплаўшчыкаў, але ўжо было позна —праз 6 дзён курсы закрыліся.

Для сплаўных работ арганізавана 88 арцеляй, у якія ўваходзяць 4.800 рабочых. Але гэтай колькасьці сплаўшчыкаў зусім мала для выкананьня плану на сплаўных работах.

Паводле праграмы, трэба было загатаваць каля 3 млн. гужбы (для вязкі плытоў), між тым, гэта заданьне выкана на толькі на 25 проц.

Харчовымі прадуктамі сплаўшчыкі забясьпечаны слаба. Мясцовыя прафэсыянальныя арганізацыі не пакланаціліся аб абсталяваньні ларкоў у сплаўных раёнах. У Тураўскім раёне нагладаліся такія выпадкі, калі па некалькі разоў пасылаліся за дзесяткі вёрст падводы па прадукты і яны вярочыліся пераражнякам з прычыны галавацяпства і нядбайнасьці кааперацыйных арганізацый. У іншых раёнах таксама прыходзіцца езьдзіць па прадукты за 25 вёрст, ня гледзячы на тое, што на месцы сплаву ёсьць крамы, але яны адмаўляюць выдаваць прадукты для сплаўшчыкаў — спасылаючца на тое, што ў іх няма для гэтага патрэбнага загаду.

Дрэнна таксама пастаўлена і забесьпячэньне сплаўшчыкаў спэцвопраткай. Цэнтрасаюз прыслаў цёплую вопратку і валёнкі, у той час, калі на дварэ стаіць цёплае падвор'е. Толькі ў красавіку пачалі паступаць боты, з якіх 50 процантаў зусім нядатны для сплаву.

Прафсаюзныя арганізацыі нічога канкрэтнага не зрабілі па арганізацыі вытворчых нарад на паляпшэньні сплаўных работ. Культмасавая работа сярод сплаўшчыкаў таксама пастаўлена вельмі дрэнна.

Трэба прыняць тэрміновыя меры па выпраўленьні ўсіх гэтых памылак.

М. ВАПЕЛЬНІК.

НЕ ДАПУСЬЦІЦЬ АДЛІВУ СПЛАУШЧЫКАЎ

(Ад наш. гомельскага карэспандэнта)

Рабочай сілай сплаў забясьпечаны на 95 проц. З некаторых сплаўных раёнаў паступаюць весткі аб тым, што частка сплаўшчыкаў мяркуе кінуць месца сваёй работы і пайсьці на сьвяты на некалькі дзён дадому.

РВК, работнікі Лесбелу, саюз сельгаслесарабочых і брыгадзіры, якія працуюць на сплаве, павінны прыняць усе меры і растлумачыць сплаўшчыкам ролю і значэньне сваячасовага сплаву лесаматар'ялаў. Сплаўшчыкі павінны добра сабе ўсьвядоміць, што ад пасьпяховага канца сплаву залежыць выкананьне пляну будаўніцтва ў акрузе і бесьперабойная работа заводаў. Ні ў якім выпадку нельга дапусьціць, каб сплаўныя лесаматар'ялы пакідаліся рабочымі ў дарозе. Гэта можа выклікаць вялікую шкоду для нашага далейшага будаўніцтва.

Трэба таксама адзначыць, што нашы мясцовыя гаспадарчыя, прафэсыянальныя і іншыя арганізацыі да апошняга часу не зварачалі належнай увагі на правядзеньне сацыялістычнага спаборніцтва паміж сплаўшчыкамі. Між тым, толькі праз заключэньне сацыялістычных дагавароў паміж групамі сплаўшчыкаў і паасобнымі сплаўшчыкамі можна паскорыць ход сплаву і ўнікнуць цэлага раду хібаў у сплаве. Партыйным, камсамольскім і прафсаюзным арганізацыям трэба прыняць усе меры да разгортваньня сацспаборніцтва паміж арцелямі, брыгадамі і паасобнымі сплаўшчыкамі.

Трэба паляпшыць і культурна-бытавое абслугоўваньне сплаўшчыкаў, бо да апошняга часу ў гэтых адносінах абсалютна нічога ня зроблена. З узмацненьнем культурнай работы, асабліва антырэлігійнай прапаганды, мы дабіўмся таго, што на вялікодныя сьвяты ўсе сплаўшчыкі застануцца на сваіх базавых мясцох сплаўнага фронту.

Ж.

Лесбел не дагадаўся пабудаваць застаў

Сплаў лесу на Бабруйшчыне (Бярозa, Сьвіслая і інш.) праходзіць большмени задавальняюча. Горш пастаўлена гэта работа на іншых менш важных рэчках. Напрыклад, на рэчцы Альшанка сабралася да 30.000 куб. мэтраў лясных матар'ялаў, якіх нельга сплаўляць з прычыны мелкаводзьдзя гэтае рэчкі. Нястача вады перашкаджае таксама сплаву і на рэчцы Сушка, дзе знаходзіцца звыш 5.000 куб. мэтраў будаўлянага лесу.

Усё гэта выклікае вялікія прастоі, павялічвае выдаткі на найманьне падзеньнікаў для прасоўваньня гэтага матар'ялу на вадзе на вяроўках. Між тым, усе гэтыя непармальнасьці можна было-б зьнішчыць, калі-б былі пабудаваны заставы на рэчках Сушка і Альшанка. Але Лесбел чамусьці не дагадаўся зрабіць гэтага.

На сплаве не хапае лодак. Не хапае мэдыцынскага пэрсаналу для абслугоўваньня сплаўшчыкаў.

Дасюль амаль нічога ня зроблена для паляпшэньня культурна-бытавога абслугоўваньня сплаўшчыкаў. Мясцовыя арганізацыі гэтым пытаньнем зусім ня цікавяцца і сплаўшчыкі свой вольны час займаюць п'янствам і гульнёю ў карты.

Д. МАГІДАЎ.

РАШУЧА ЗЬНІШЧЫЦЬ ПАРУШЭНЬНІ ВЫБАРЧАГА ЗАКОНАДАЎСТВА

У радзе месц мы за апошні час мелі выпадкі самага грубага парушэньня выбарчага законадаўства. У супярэчнасьць з усімі дырэктыўнымі паказаньнямі выбарчага законадаўства, мясцовыя органы дапусьцілі рад яўных парушэньняў выбарчае інструкцыі, што выяўлялася ў няправільным пазбаўленьні выбарчых правоў грамадзян і ва ўсялякіх абмежаваньнях гэтых грамадзян да канчатковага вырашэньня іх спраў у вышэйшых органах Савецкае ўлады.

Гэтыя акалічнасьці выклікалі спэцыяльную пастанову прэзыдыуму ЦВК СССР, накіраваную на безадкладнае і рашучае зьнішчэньне ўсіх парушэньняў выбарчага законадаўства, на ліквідацыю ўсіх памылак, перагібаў і злоўжываньняў у гэтай справе.

Наша інструкцыя аб перавыбарах саветаў у поўнай меры дакладная і суадпавядае сучаснасьці. Таму яна павінна праводзіцца ў жыцьцё са ўсёй уважлівасьцю і суровасьцю. Аднак, як у часе перавыбараў саветаў, так і наогул, мы наглядаем ня мала перагібаў, парушэньняў, фактаў простага галавацяпства. Ужо само павялічэньне процанту пазбаўленых выбарчых правоў (у параўнаньні з 1929 г.) па тых саветах, якія зараз пераабіраліся, з 1,9 проц. да 4,8 проц. паказвае, што, побач з сапраўдным дадатковым выяўленьнем кулацка-нэпманскіх элемэнтаў (што зусім неабходна і правільна), дапушчана многа парушэньняў закону. Аб гэтым сьведчаць канкрэтныя факты, калі пазбаўлялі выбарчых правоў серадняковых, нават, беднякоў за тое, што яны «добраахвотна» ня ўступалі ў калгас, за тое, што той ці іншы серадняк не вызваліўся яшчэ ад рэлігійнага дурману і зьяўляецца царкоўным старастай. Часта пазбаўляліся права працоўныя сем'і былых паліцэйскіх, члены сям'і асоб, якія знаходзяцца пад судом і сьледствам; пазбаўлялі — па старасьці, глухіх, сьляпых, «бузацёраў» і г. д. У Вяцемльскім раёне нават умудрыліся пазбавіць выбарчага права аднаго пастуха, які, захваляўшы, перадаў сваю работу (на тых умовах, на якіх і сам ён наймаўся) другому на час да выздараўленьня.

Ёсьць ясныя паказаньні 34 арт. інструкцыі аб тым, што ня могуць быць пазбаўлены выбарчых правоў займаючыяся вытворчай грамадзка-карыснай працай члены сям'і лішэнцаў, калі яны матар'яльна ад апошніх не залежаць. Незалежна ад гэтага некаторыя саветы і выбарчыя камісіі пазбаўлялі выбарчых правоў тых асоб, якія маюць блізкага сваяка, пазбаўленага выбарчага права, хаця яны ніколі ні ў якой залежнасьці ад гэтых сваякоў ня былі, ці даўно гэтую залежнасьць парвалі і жывуць самастойна, на сродкі ад грамадзка-карыснай вытворчай працы.

Ня гледзячы на катэгарычнае запатрабаваньне выбарчага законадаўства аб тым, каб уняесьленне ў сьпісы пазбаўленых выбарчых правоў грамадзян праводзілася на падставе дакумантальных даных, ці праверэраных паказаньняў сьведак, пры ўважлівым пэрсанальным абгаварэньні, мелі месца такія выпадкі, калі выбарчых правоў пазбаўляліся цэлыя групы насельніцтва. Напрыклад, мела месца механічнае пазбаўленьне выбарчага права грамадзян, якія індывідуальна абкладаліся с.-г. падаткам.

Каб характарызаваць становішча парушэньняў выбарчага законадаўства ў паасобных раёнах БССР, дастаткова паказаць на факт пазбаўленьня выбарчых правоў 14 проц. усяго дарослага насельніцтва па Смалявіцкім раёне.

І таму зусім натуральна, што на апошніх сваіх пасяджэньнях Цэнтральная Выбарчая Камісія, у адмену пастаноў ніжэйшых камісій, аднавіла ў выбарчых правох да 40 і звыш процантаў скаргаў, ня лічачы таго, колькі ўжо адноўлена ў акруговых інстанцыях. Мы сустракаемся з радам выпадкаў, калі да серадняковых пазбаўленых выбарчых правоў, дапушчалася раскулачваньне.

У значнай ступені парушэньне выбарчага законадаўства абумоўлена няправільнай арганізацыяй справы складаньня сьпісаў асоб, пазбаўленых выбарчага права, без выкананьня абавязковага запатрабаваньня інструкцыі ў гэтай галіне, пры нядбайнасьці і безадказнасьці паасобных работнікаў выбарчых камісій, саветаў і выканкомаў.

Замест таго, каб пры выбарчых кампаніях дапамагаць выбарчым камісіям у справе складаньня гэтых сьпісаў, некаторыя ЖАКТ'ы, мясцкомы і іншыя арганізацыі самі пазбаўлялі выбарчых правоў працоўных грамадзян. На вялікі жаль, паасобныя калгасы таксама «грашылі» самаўладзьтвам і пазбаўлялі выбарчых правоў членаў калгасаў. Так, напрыклад, савет калгасу «Хваля Рэвалюцыі» на сваім пасяджэньні пастанавіў: «пазбавіць выбарчага голасу Банчука Ўладыку і яго жонку Натальлю на 6 мес. кожнага; пазбавіць Аксёню голасу на 6 месяцаў; пазбавіць голасу Паўла на 3 месяцы і яго жонку на адзін год; пазбавіць голасу Мікалая на 6 месяцаў і жонку яго на 1 год і г. д. У гэтым зьявішчы ня толькі характэрна грубае парушэньне правоў працоўных грамадзян—членаў калгасаў, але яшчэ і тое, што працоўныя жанчыны сялянкі-калгасьніцы, як найбольш адсталыя ўдзельнікі ў сацыялістычным будаўніцтве, пазбаўляліся правоў на большы тэрмін, чымся мужчыны. Зразумела, што гэтым усім самаўпраўствам павінен быць палажаны канец самым рашучым чынам.

Ня гледзячы на тое, што яшчэ ў мінулым годзе былі прыняты і апублікаваны спэцыяльныя дадатковыя пастановы прэзыдыуму ЦВК БССР аб парадку вырашэньня скаргаў грамадзян, пазбаўленых выбарчага права, з папярэджаньнем, што да вырашэньня справы ў вышэйшай інстанцыі ніякіх іншых абмежаваньняў, акрамя абмежаваньня ўдзельнічаньня ў выбарах, да гэтых асоб не павінна ўжывацца, гэтыя пастановы слаба, а часам і зусім ня выконваліся. Наадварот, мы маем рад выпадкаў дадатковага незаконнага абмежаваньня асоб, пазбаўленых выбарчага права, як напрыклад: высяленьне з кватэр, гарадоў, агульнае пазбаўленьне заборных кніжак, адмаўленьне ў мэдычнай і юрыдычнай дапамозе, пазбаўленьне права забудоўлі, выключэньне дзяцей са школы, выключэньне з вытворчых арцеляй, раскулачваньне, абкладаньне індывідуальным падаткам і г. д.

Даволі папыраны зьявішчы, калі асобе, пазбаўленай выбарчага права (часта зусім няправільна) саветы або іншыя органы адмаўлялі ў выдачы патрэбных даведак і гэтым самым пазбаўлялі іх магчымасьці скардзіцца і давесьці нягрунтоўнасьць пазбаўленьня іх выбарчых правоў ў вышэйшыя органы Савецкае ўлады.

Самы разгляд скаргі на пазбаўленьне выбарчых правоў, часта зацягваўся ў кожнай інстанцыі месяцамі, а да вырашэньня ў апошняй інстанцыі, часам, і больш году.

Усе гэтыя скрыўленьні вызначаны і рашуча асуджаны дырэктывай прэзыдыуму ЦВК Саюзу ССР ад 22 сакавіка г. г. На падставе дырэктывы Саюзнага ўраду і ў мэтах рашучага зьнішчэньня парушэньняў выбарчага законадаўства прэзыдыум ЦВК БССР прыняў адпаведную пастанову, якую трэба хутка і рашуча выканаць.

Пастанова прэзыдыуму ЦВК прадугледжвае безадкладную праверку сьпісаў асоб, пазбаўленых выбарчых правоў, спэцыяльнымі камісіямі. Таму перш за ўсё неабходна, каб ў гэтых камісіі ўвайшлі та

Да прыёму току Асінбуду

ПРАДПРЫЕМСТВЫ ЯШЧЭ НЕ ПАДРЫХТАВАНЫ

У практыцы будаўніцтва раённых электрастанцый у СССР былі выпадкі, калі з-за непадрыхтоўкі спажыўцоў электра-току, станцыі значны час пасьля пуску працавалі ўхаластую, без належнай нагрузкі, што прыводзіла да вялікіх страт (Кізэлаўская, Балахнінская, Зема-Аўчальская раённыя электра-станцыі).

Засталося некалькі месяцаў да пуску першай беларускай дзяржаўнай раённай электра-станцыі імя тав. Сталіна (Асінбуд). Зусім сваячасова зараз выпукляецца пытаньне аб тым, як ідзе падрыхтоўка спажыўцоў да прыёму току Асінбуду. Мы павінны прыняць меры, каб не паўтарыць памылак, якія мелі месца на паказаных электра-станцыях і сваячасова падрыхтаваца да прыёму току.

Наведаўшы Асінбуд, мы наконт гэтага мелі гутарку з намесьнікам старшыні камісіі па падрыхтоўцы спажыўцоў току Асінбуду — інжынэрам **Броцкім**. Тав. Броцкі паведаміў наступнае:

— Галоўным спажыўцом току Асінбуду першай чаргі зьяўляецца Віцебск. Тут ток атрымае 40 прадпрыемстваў. Праекты электрыфікацыі гэтых прадпрыемстваў у большасьці ўжо гатовы і зацьверджаны. Электра - абсталяваньне было сваячасова заказана і ў значнай частцы ўжо паступіла на месца. Зараз праводзіцца мантаж электра-абсталяваньня.

Для пасьпяховага правядзеньня мантажных работ, паводле патрабаваньня камісіі, у Віцебску арганізавана мантажна - тэхнічная кантора ВЭО (былы ГЭТ), якая павінна займацца спэцыяльна гэтай справай. Аднак, кантора яшчэ не разгарнула сваёй работы з-за недахвату тэхнічных сіл. З прычыны гэтага мантажныя работы на сёнешні дзень ідуць яшчэ слаба.

Ужо закончан мантаж электра-ўстановак на наступных прадпрыемствах Віцебску: фабрыцы акуляраў, драждавым заводзе (сілавая частка), гарбарні, хлебазаводзе, друкарні агульнай магутнасьцю каля 2.000 кілёват.

Зараз вядуцца мантажныя работы на махорачнай фабрыцы, ільна-прадзільнай фабрыцы «Дзьвіна». У бліжэйшы час пачнецца электра-абсталяваньне на панчошна-трыкатажнай фабрыцы.

Трэба адзначыць, што некаторыя прадпрыемствы вельмі марудзяць з падрыхтоўкай да прыёму току, зусім няўважліва адносяцца да гэтай важнейшай работы.

Так, завод «Чырвоны Мэталісты», алейня Белхарчтрэсту, Віцебскі камунальны трэст (будаўніцтва і мантаж сілавых трансфарматарных кіёскаў) вельмі марудзяць з падрыхтоўкай да прыёму току.

Другім спажыўцом току Асінбуду зьяўляецца Ворша. Аднак, большасьць прадпрыемстваў Аршаншчыны, якія павінны атрымаць ток Асінбуду, вельмі слаба рыхтуюцца да прыёму току. Цьвіковы завод «Чырвоны Кастрычнік», Дубровенская фабрыка «Дняпроўская Мануфактура» і інш. да гэтага часу мала што робяць для падрыхтоўкі да прыёму току.

Трэба сказаць, што падрыхтоўку да прыёму току гармозяць Белмэталітрэст і Тэкстыльтрэст. Гэтыя трэсты бязупынна зьмяняюць даныя для праектаў і пляны пашырэньня рэканструкцыі заводаў, што не дае магчымасьці прыступіць да мантажу электраабсталяваньня.

Нашы гаспадарнікі зусім ня ўлічваюць, што за кароткі тэрмін «ВЭО» ня зможа справіцца з усёй масай работ на электраабсталяваньні. Яны, гаспадарнікі, разважаюць, што, моў, яшчэ шмат часу да пуску Асінбуду і таму няма чаго сьпяшацца. Такія разважаньні вельмі шкодныя, бо фактычна зрываюць падрыхтоўку да прыёму току.

Трэба зараз-жа прыняць меры для фарсаваньня падрыхтоўкі для прыёму току. Мы павінны ва што-б там ні стала забясьпечыць поўную падрыхтоўку спажыўцоў току Асінбуду да моманту пуску станцыі.

С. ГАЛКІН.

Асінбуд.

НА БАРАЦЬБУ З П'ЯНСТВАМ

Сёньня пачынаецца антыалкагольная дэкада

Менскі акруговы камітэт па барацьбе з алькагалізмам праводзіць з 18 да 27 красавіка па гор. Менску антыалькагольную дэкаду.

Мэта антыалькагольнай дэкады — узмацніць барацьбу з пьянствам на вытворчасьці, дапамагаць разгортванню сацыялістычнага спаборніцтва, павесьці рашучую барацьбу з п'янымі прагуламі, узьняць прадукцыйнасьць працы і працоўную дысцыпліну на заводах і фабрыках. Антыалькагольная дэкада ставіць сабе мэтай прыцягнуць шырокую грамадзкую думку вакол барацьбы з алькагалізмам, уцягнуць у антыалькагольныя т-вы працоўную моладзь, піянэраў, школьнікаў, жанчын.

Дэкада павінна ўнесьці рашучы пералом у бок больш актыўнага ўдзелу ў барацьбе з алькагалізмам пізавых партыйных, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый. Да гэтага часу з боку паказаных арганізацый наглядалася абсалютная пасыўнасьць да пытаньняў барацьбы з алькагалізмам, што затрудняла работу антыалькагольных ячэек на прадпрыемствах, дзе яны ёсьць. На радзе прадпрыемстваў антыалькагольныя ячэйкі зусім яшчэ ня існуюць, што таксама тлумачыцца пасыўнымі адносінамі да гэтай работы з боку пізавых арганізацый.

На працягу антыалькагольнай дэкады па прадпрыемствах Менску будуць арганізаваны антыалькагольныя вечары, даклады, гутаркі ў часе абедзенага перапынку і г. д.

У кіно-тэатрах і рабочых клюбах будуць дэманстравацца антыалькагольныя фільмы («За ваша здароўе», «Трывога», «Крывая лінія» і інш.).

21 красавіка адбудзецца пашыранае пасяджэньне навуковай асацыяцыі дактароў з удзелам прадстаўнікоў антыалькагольных ячэек і раду іншых арганізацый, на якім будзе пастаўлен даклад аб алькагалізьме ў БССР і яго сацыяльных выніках.

Менская радыё - станцыя будзе перадаваць у сваёй радыё-газэце спэцыяльную антыалькагольную старонку. Акрамя гэтага, будзе выпушчана адпаведная друкаваная газэта «На барацьбу з п'янствам».

У канцы дэкады адбудзецца вялікі антыалькагольны дыспут.

ЖАКТ'ы ў антырэлігійнай прапагандзе

Сёньня ў клюбе Камасьветы адкрываецца анты-рэлігійная канфэрэнцыя хатніх гаспадынь менскіх ЖАКТ'аў і ЖБКТ. На гэтай канфэрэнцыі будзе зроблены даклад на антырэлігійную тэму. Апрача таго, будзе абмяркоўвацца пытаньне аб лепшай пастаноўцы антырэлігійнай прапаганды ў нашых ЖАКТ'ах.

Для праверкі анты-рэлігійнай прапаганды па ЖАКТ'ах будуць вылучаны ўдарныя брыгады. Трэба адзначыць, што БЖС у гэтым напрамку прарабіў ужо вялікую работу. Была праведзена кампанія па здачы каштоўнасьцяй у фонд індустрыялізацыі.

Многія хатнія работніцы ЖАКТ'аў выказалі вялікую сьвядомасьць у справе практычнага ўдзелу ў нашым будаўніцтве. Яны здавалі ў фонд індустрыялізацыі ліхтары, крыжы і інш. каштоўныя рэчы, якімі карысталіся па 30—40 год.

ГОЛЬДВАСЭР.

МЕНСК

Масавая экскурсія „Чырвонай Зьмены"

Рэдакцыя газэты «Чырвоная Зьмена» наладжвае ў маі месяцы масавую экскурсію камсамольцаў і працоўнай моладзі БССР па Украіну па маршруце — Гомель—Кіеў—Днепрабуд. Усяго ў экскурсіі прыме ўдзел 300 чал. Кошт месца (праезд параходам, чыгункаю, харчаваньне, інтэрнат і інш.)—46 руб. для аднаго чалавека.

У часе побыту экскурсантаў-дэлегатаў у Кіеве, Днепрапятроўску і Днепрабудзе будуць наладжаны масавыя сустрэчы экскурсантаў працоўнай моладзьдзю Украіны.

Фізкультурнае выхаваньне студэнтаў

Прэзыдыум ВСФБ, азнаёміўшыся з пастаноўкаю фізкультурнай працы ў БДУ, канстатаваў, што фізкультурнае выхаваньне сярод студэнцтва вялося вельмі слаба. Ня было адпаведнага кіраўніцтва гэтай работай з боку МАСФК, Наркамасьветы і кіруючых органаў БДУ. У БДУ зусім няма памяшканьня для фізкультурнае работы, адсутнічае таксама і праграма работы. Прэзыдыум ВСФК прыняў цэлы рад канкрэтных пастаноў па паляпшэньні фізкультурнага выхаваньня сярод студэнтаў БДУ.

Санітарная станцыя ў Менску

Санітарныя дактары г. Менску на нарадзе пастанавілі хадайнічаць перад НКАЗ аб арганізацыі ў Менску санітарнае лябораторыі. Апрача таго пастаноўлена прасіць НКАЗ пры складаньні каштарысу пяцігодкі ўключыць сродкі на пабудову ў Менску санітарнай станцыі. Паводле праекту, гэта станцыя будзе мець дэзынфэкцыйную камэру, прышчэпны пункт, ізаляцыйны дом, лябараторыю і інш.

Выдача прадуктаў і тавараў

МЦРК пачынае выдаваць пайшчыкам па дзіцячых кніжках па 500 грам цукру і 500 рыбу на дзіця.

Абутак для пайшчыкаў будзе прадаваецца выключна па новых наборных кніжках.

Шэфства саюзу саўгандальслужачых над саюзам рабземлес

Гэтымі днямі адбыўся пленум ЦП саюзу саўгандальслужачых, на якім абмяркоўвалася пытаньне аб шэфстве саюзу саўгандальслужачых над саюзам рабземлес. Саюз саўгандальслужачых прыняў шэфства над саюзам рабземлес і заключыў з ім сацыялістычны дагавор аб культурнай дапамозе саюзу працаўнікоў зямлі і лесу.

У дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве ўключаны пункт адносна культурна - бытавога абслугоўваньня сплаўшчыкаў лесу. Апрача таго, саўгандальслужачыя бяруць на сябе абавязак арганізаваць радыё і кіно-перасоўкі для рабочых зямлі і лесу, адкрыць курсы вылучэнцаў і інш. 30 гарадзкіх калектываў саўгандальслужачых бяруць шэфства над рабачкомамі. Апрача таго, ЦП саюзу саўгандальслужачых пасылае на сталую працу ў калгасы 50 членаў саюзу.

Тэрмін выкананьня сацыялістычнага дагавору—1 сьнежня г. г.

Здарэньні

«АГЕНТ АКРФА»

У Менску за апошні час зьявіўся аферыстны, які выдае сябе за агента акрфа. Спрытны жулік робіць вобыскі ў саматужнікаў і знойдзеныя ім каштоўнасьці забірае сабе. Ніхто з нацярпеўшых не здагадаўся напрасіць у яго мандат ці ордэр.

Крымвышук прапануе жыхаром затрымліваць усіх, хто паспрабуе рабіць вобыскі бяз ордэраў, мандатаў і паняты х.

ПАЖАР

У ноч з 15-га на 16-га красавіка ў м. Дукоры, Сьмілавіцкага раёну, выбухнуў вялікі пажар. Пацярпела 32 сям'і. У агні згарэла 26 жылых будынкаў, 24 хлявы, 10 гумнаў, 6 сьвірнаў, клюб і шмат іншага. Страты вялікія. Прычыны пажару высьвятляюцца. На месца здарэньня выехалі работнікі міліцыі і крымвышуку на чале з тав. Кролем. Падазраваецца куладкі падпал.

З лістоў рабселькораў

Гапавацяпства дырэктара лесапільні

Недалёка ад станцыі «Цёмны лес» (Аршаншчына) знаходзіцца шмат лесу. Тут-жа працавала лесапільня, якая мела вяліке значэньне для лясное прамысловасьці. Работа на лесапільні была пастаўлена безгаспадарча, у выніку рабочыя пачалі крытыкаваць дырэктара. Дырэктру гэта вельмі не спадабалася. І каб зваліць з сябе віну за безгаспадарчасьць, дырэктар **Ціханаў** парашыў ліквідаваць лесапільню. На ліквідацыю лесапільні даў згоду прэзыдыум Аршанскага АВК, які быў уведзены дырэктарам у эман. Між тым, з боку РСІ і акрутовага аддзяленьня саюзу дрэваапрацоўшчыкаў высунуты пярэчаньні дырэктараўскаму пачынаньню, але яны засталіся ня прынятымі.

В.

Вінаватых у цяганіне пакарацъ

Заводу імя **Халтурына** (Бабруйшчына) патрэбна было устанавіць стругальны варштат. Каб пусьціць варштат, патрэбна было 5 шківаў. 17 лістапада 1929 году заводакіраўніцтва пакіравала заказ гомельскаму заводу **«Пралетары»**. На працягу 5 месяцаў адміністрацыя заводу «Пралетары» маўчала, ня гледзячы на цэлы рад напамінкаў з боку заводу імя Халтурына. Такіх напамінкаў паслана каля 10. Урэшце, завод камандыраваў свайго спэцыяльнага прадстаўніка ў Гомель даведацца аб выніках заказу. Апошні над нацiскам усё-ж прывёз 3 шківы, а 2 так і засталіся ня зробленымі. Варштат стаіць, а шківаў няма.

Галавацяпству трэба пакласьці канец.

МЭЙЦІН.

Каапэратары не клапоцяцца аб забесьпячэньні абуткам

Сяляне **Каралінскага** раёну (Мазыршчына) едуць у Жытомір і іншыя гарады Украіны, каб набыць абутак і вопратку, бо апошняй не хапае ў каапэрацыі Каралінішчыны. На гэту паездку сялянамі трацяцца значныя сродкі, даргі час і інш. А каралінскія каапэратары не клапоцяцца аб забесьпячэньні працоўнага сялянства патрэбным абуткам і вопраткай.

Адпаведныя каапэрацыйныя арганізацыі павінна зараз - жа зацікавіцца гэтым пытаньнем.

СЫРОВЫ.

Работа ажывілася

У вёску Крыстампольле, Пухавіцкага раёну, прыехаў новы настаўнік і разгарнуў масавую работу. Выпускаецца зараз два разы ў месяц насьцен-газэта «Рунь», апошняя заваявала сабе аўтарытэт сярод насельніцтва. У газэту піша шмат сялянства. Газэта адбівае ўсе бягучыя пытаньні.

ВЯСКОВЫ.

ПРАЦУЮЦЬ БЯЗ ПЛЯНАЎ

На торфараспрацоўках **«Асінторф»** (Аршаншчына) адсутнічаюць якія-б там ні было пляны. Усе цэхі працуюць бяз плянаў, як хто хоча. Адміністрацыя ніякіх мер да складаньня плянаў ня прымае, бюракратычна адносіцца да выкананьня сваіх абавязкаў. Кіраўнік работ на паперках кладзе такія рэзалюцыі: «хозчасть», «техчасть» і г. д. Ніякай ініцыятывы няма.

ТАРФЯНІК.

Рабочыя заводу „Дрэваапрацоўшчык" арганізавалі гародна-садовае таварыства

Па ініцыятыве калектыву рабочых заводу «Дрэваапрацоўшчык» на Камароўцы арганізавана гародна-садовае таварыства.

Таварыства ўзяло для апрацоўкі 2 агароды, плошчаю ў 30 гэкт., якімі раней карысталіся прыватнікі-гандляры.

14-га красавіка адбыўся сход членаў садова-гароднага таварыства. Рабочыя заводу «Дрэваапрацоўшчык» пастанавілі ўсім калектывам уступіць у гэта т-ва і распачаць у тэрміновым парадку падрыхтоўчую работу да сяўбы. Для сваячасовага закончэньня работы на гародах мяркуецца правесьці некалькі суботнікаў і пядзельнікаў.

Для кіраўніцтва ўсёй гаспадарчай работай абрана камісія з 11 асоб. Камісія ўжо распачала сваю працу.

Таварыства будзе забясьпечана цягаваю сілаю, насеньнем і сельска-гаспадарчым інвэнтаром. Увесь прыбытак ад гэтых садоў і гародаў паступае цалкам на паляпшэньне добрабыту рабочых заводу «Дрэваапрацоўшчык».

В. ЖУКАЎ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Ад Кастрычніцкага РК КП(б)Б. Наступныя таварышы прымацаваны да прадпрыемстваў для правядзеньня 1-га мая:

Ад БДУ: Каранеўскі—экспл. тав., Канаплін—да ДЭПО, Рыўлін—малы рамонт вагонаў, Сікерская—абутковая фабрыка, Сініцын—шчацінная фабрыка, Голан—завод «Чырвоны Хэмік», Белька—малочны завод, Шаліма—чыгунка таварная, Цёмкін—чыг. пасаж.; ад НКЮ: Сташаўскі—вагон. майст., Міхайлаў—Скурсындыкат і Мар'ясіна—ЦІП; ад ВСНГ: Стракоўскі—зав. «Бальшавік» і Кейлін—грузчыкі; ад НКФ: Мікуліч—зав. «Адраджэньне»; ад ДПУ: Губская—ЦРД і Міхайлаў—Белсампрамсаюз; ад ЦКК-РСІ—Юргенсон—эксп. пасажырск., Лазоўскі—каўбасная фабрыка, Ляўкоў—фармазавод і Ракаў—ЦРД; Чыневіч (УЧК)—5-ты ўзвод аховы, Ашаровіч (БАН)—завод «Энэргія», Падольскі — да заводу «Чырвоная Зара», Царонак (Белмяса)—бойня, Задаеў (эксп. пас.) — абутковая майстэрня, Рамізэвіч (ЦК ЛКСМБ)—УМТ, Эрэнбург—да сьпіртазаводу, Баркоўскі (акрпракуратура)—лямцавая фабрыка, Кугель (радыё-універсытэт) — шкло-завод, Пыжыкаў (Белпаляводсаюз)—шчотачная ф-ка, Красоўскі (Белсельсаюз) — база Дзяржгандлю, Ліўшыц (НКЗ)—«Чырвоны Крыж», Багарат (малочны саюз) — палата мер і вагі, Жыгмунд (НКА)—спраўдом, Эфром—да Белсампрамсаюзу, Копелева—Белсампрамсаюз, Гайдук (Наркамсабез) — БСІКА, Эленаў—БСІКА і Нікольскі—да Белсампрамсаюзу.

Т. т. Розенгауз, Яршоў, Хаскін, Галемшток, Вінаградаў, Палякоўскі, Гурло, Мазэлей, Дубравіцкі, Шолумаў і Рэзьнікава будуць накіраваны па пуцёўках АПА РК КП(б)Б. Усе таварышы павінны зьявіцца на кансультацыю па гэтым пытаньні ў Дом Камасьветы.

Аб часе кансультацыі будзе паведамлена дадаткова.

Сьпіс дакладчыкаў для правядзеньня першамайскага сьвята па Фрунзаўскім раёне.

Ад камвузу: Ярмолін—завод «Пралетары», Лур'е—зав. «Беларусь», Буткевіч — «Чырвоны Тэкстыльшчык» і Аўчыньнікаў—ф-ка «Беларуска»; ад рэдакцыі «Зьвязда»: Мітлін—завод «Дрэваапрацоўшчык», Асьмоў — ф-ка «Кастрычнік» і Красьнеўскі—13-ты ЖАКТ; ад ЦСПСВ: Клімковіч—завод «Камунар», Мірынгоф—п.-к. краўцоў і Рыжоў—Менгандальбуд; ад ЦК КП(б)Б: Канакоцін—Белдзяржбуд, Гурэвіч — Белдзяржбуд, Будзінскі—1-я друкарня, Хмялеўская—Белжылсаюз; Гольдберг (Дзяржшлян)—ф-ка «Камунарка», Дунец (рэд. «Акцябр»)—ф-ка «Кастрычнік», Шукевіч-Трацьцякоў («Беларуская Вёска»)—шпалерная ф-ка, Джэлюк («Чырвоная Зьмена»)—Белдзяржбуд; ад СНК: Кузьняцоў—Менгандальбуд, Бэнэк—Эльвод, Гэйнэ—6-ты ЖАКТ; ад ЦВК: Сакольскі—футровая фабрыка, Ульянаў—1-я друкарня і Мачульскі—п.-к. абутнікаў, Абрамсон (Наркамгандаль) — Менгандальбуд, Сандлер (Белдзяржстрах)—хлебазавод, Савіцкі (Белдортранс)—п.-к. Паліграф; ад НКА: Галавач—кандытарская ф-ка і Некрашэвіч—друкарня «Зьвязды» Шастакоў (ЦСУ)—цагельні Белстромтрэсту, Грабузоў (Лесбел) — саюз будаўнікоў, Луцкевіч (Белпайгандаль) — аўтакіраўніцтва, Гнілякевіч (Наркампрацы) — каап. прадпр. харчавікоў, Сакалінскі (ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў)—рымарская ф-ка, Сьнежка (Мэталяўстановы)—Абкамтрэст, Стрэле (ЦСУ)—цэнтр. пажарная каманда, Якаўлеў (рэд. газ. «Рабочий»)—ДЭТ; ад Белпэдтэхнікуму: Прусьліна—ЖАКТ № 1; Чарнецкі ЖАКТ № 3, Каган (Саюзхлеб) — ЖАКТ № 2, Чарот (БДВ)—ЖАКТ № 4, Казак (БАН)—ЖАКТ № 5, Грыцкевіч (Пралетстуд)—ЖАКТ № 12, Папаў (ВСНГБ)—ЖАКТ № 14, Кацэнэльсон (ЦСУ)—ЖАКТ № 18, Захарава (Наркампрацы)—ЖАКТ № 8; да прыгараднага сельсавету прымацоўваюцца: Улезла (бульбяная станцыя), Вайцаховіч і Масюкоў (Наркамзем), Папко (НК-РСІ), Серба (Дом Селяніна), Аскерка (ЦП саюзу с.-г. рабочых) і Бялян (Акрвыканком).

Усім ячэйкам трэба дагаварыцца з вылучанымі дакладчыкамі аб дні і часе сходу.

Савецкія ячэйкі вылучаюць дакладчыкаў самастойна.

СЕНЬНЯ.

Дэкадны камвуз. У 18 гадз.—заняткі на ўсіх трох цыклях. Лектары Аксельрод, Гэсен і Саевіч.

ЦК МОПР'у (Савецкая, 87). У 19 гадз. пасяджэньне прэзыдыуму ЦК. Запрашаюцца т. т. Славінскі, Бэйлін, Панаў, Пудзін, Вішнеўскі, Гармізэ, Клыс і Гофман.

Менскі рабфак (Чырвонаармейская вул.) у 10 гадз. нарада рабфакаў. Парадак дня: 1. Інфармацыя аб першай усесаюзнай нарадзе студэнтаў рабфакаў, 2. Аб спэцыяліз. рабфакаў і прымацаваньні іх да паасобных ВНУ. 3. Аб арганізацыі студ. прафработы на вяч. і дзен. рабфаках.

Дом асьветы. Лекцыя на тэму, як праводзіць анты-вялікодную кампанію ў школах. Пач. у 20 гадз.

Клініка дзіцячых хваробаў. Пасяджэньне сэкцыі па ўнутраных хваробах. Пач. у 8 з паловаю гадз. Парадак дня: Д-нт **Гінзбург.** Дыфэрэнцыяльная дыагностыка паміж нэрніцёзнай анэміяй і ракам. Д-нт **Сітэрман.** Зьмены ў электракардыяграфічнай крывой пры аблітэрыруючым эндартэрыіце каранарных судзін. Д-нт **Маршак.** Асновы сучаснай клясыфікацыі лёгачных сухот.

Пэдгабінэт. У 19 гадз. пасядж. акрмэткамісіі. Яўка членаў мэткамісіі, бюро сэкцый і членаў канфэрэнцый абавязкова. Запрашаюцца настаўнікі.

Агульны сход асьветнікаў г. Менску. Пач. у 19 гадз. у Доме Асьветы. Парадак дня: антырэлігійная работа ў школах.

Ад ЦП саюзу Працасьветы. У 19 гадз. у памяш. ЦП сход арганізацыйна-інструктарскага сэктару. Яўка ўсіх добраахвотнікаў абавязкова.

Дом Камасьветы (вул. К. Маркса, 30). У 18 гадз. канфэрэнцыя хатніх гаспадынь беларусак і поляк па разданых білетах ЖАКТ'амі. Яўка абавязкова і без спазьненьня.

Агульны сход членаў групкому саюзу працасьветы № 3 у 3-й школе 2-гі паверх. Пач. у 20 гадз. Яўка абавязкова.

Нарада сакратароў яч. юных бязбожнікаў і юных прыхільнікаў МОПР'у, а таксама старшынь фарпостаў і вучкомаў пры ўдзеле настаўнікаў школ. Яўка абавязкова пад адказнасьць важатага фарпосту. Пач. у 8 гадз. у клюбе Камасьветы.

Клюб навуковых працаўнікоў. Дакл. т. **Сянкевіча**—Чарговыя задачы калектывізацыі. Пасьля дакладу—мастацкая частка. Пач. у 20 гадз. Білеты ў канцылярыі клюбу.

БАН. У 20 гадз.—агульны сход супрацоўнікаў БАН з парадкам дня: даклад акадэміка **Вальфсона** на тэму «Навука, рэлігія і клясавая барацьба». Пач. у 20 гадз.

Дом Асьветы. У 19 гадз. агульны сход тэхпрацаўнікоў членаў саюзу Працасьветы. Даклад аб паходжаньні вялікадня. Пасьля дакладу—кіно.

Ад камісіі па чыстцы апаруту акрфа. У 19 гадз. у **клюбе хлебазаводу** будуць зроблены вывады праверкі і чысткі апарату акрфа. Запраш. рабочыя, служачыя, чырвоناармейцы і асабліва рабочыя хлебазаводу.

У 12 гадз. у сэктары вытворчасьці і зарплаты ЦСПСБ склікаецца нарада па пытаньні рэальнай зарплаты і практычных мерапрыемстваў па яе надвышэньні. Запраш. прадстаўнікі Дзяржпляну, ВСНГБ, Белрабсэкцыі, Белсампрамсаюзу, Малочнага саюзу, Белрыбы, Белмясгандлю, НКГандлю, НК працы і ЦП саюзаў.

Да ведама навуковых працаўнікоў. Нав. працаўнікам, якія хадайнічалі аб пасылцы на курорт і ў дамы адпачынку, зьявіцца за вынікамі ў сэкцыю з 2-х да 4-х гадз. штодзенна да 20 красавіка.

БДУ. У 21 гадз. у 41 аўд. (стары будынак) адбудзецца шырокая вытворчая нарада з удзелам усяго студэнцтва факультэту саўбуду і права. На парадку дня: 1. Даклад дэкана факультэту **т. Канапліна** аб мэтавай устаноўцы факультэту, 2. Мэтады актыўнага выкладаньня і 3. Аб падагуленьні ведаў. Яўка студэнтаў і нав. працаўнікоў абавязкова.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

19 красавіка роўна а 7-ай гадз. увечары ў запі пасяджэньняў ЦСПСБ НК РСІ і ЦСПСБ

СКЛІКАЮЦЬ

НАРАДУ ЎСІХ СТАРШЫНЬ ФАБРЫЧНА-ЗАВОДЗКІХ КАМІТЭТАЎ І МК САВЕЦКІХ, КААПЭРАЦЫЙНЫХ І ГАСПАДАРЧЫХ УСТАНОЎ,

арганізатараў вытворчых сэктараў прадпрыемстваў (альбо вытворчых камісій і эканамнарад) па г. Менску.

ПАРАДАК ДНЯ:

Шэфства рабочых над Дзярж. апаратам і арганізацыя мас вакол работы РСІ па фінкантролю (дакл. РСІ).

Яўка ўсіх пералічаных тав. абавязкова.

НК РСІ і ЦСПСБ.

Т-ва „ПРЫХІЛЬНІК ДЗЯЦЕЙ" (Савецкая, 40)

СЕНЬНЯ, 18 красавіка, а 7 гадз. увечары

адбудзецца

пашыранае пасяджэньне праўленьня сумесна з прадстаўнікамі бюро ячэек і прымацаванымі дэлегаткамі.

Прысутнасьць прадстаўнікоў бюро ячэек і прымацаваных дэлегатак АБАВЯЗКОВА.

ВЫШАЎ з ДРУКУ і ПАСТУПІЎ у ПРОДАЖ. І. В. СТАЛІН—Выбраныя работы па нацыянальным пытаньні

Стар. 196. Цана 60 кап. БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

ТЭАТР і КІНО

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

Сэзон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску

Б. Лаўрэноў.

Субота, 19 красавіка для студэнцтва РАЗЛОМ п'еса ў 4-х дзеях.

Рэшта білетаў у касе тэатру і ў рабочай касе. Пачатак а 8 гадз.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

Мастацкі фільм вытворчасьці Савкіно ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ у 6 част.

Звыш праграмы кіно-хроніка Савкіно № 16.

Пач. дзен. сэанс. 1 гадз., 3 г. 20 м.

Каса з 12 г. дня.

Пач. вячэрн. сэанс. а 7 г. Каса ад 5 г. увеч.

На дзенныя сэансы цэны ад 15 к. да 35 к.

КІНО Інтэрнацыянал

Толькі 3 дні: 18, 19 і 20 красавіка

Мастацкі фільм вытворч. Савкіно ПАБОЧНАЯ ЖАНЧЫНА

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ кіно хроніка САВКІНО

Дзенныя сэансы: 1 г. 30 м., 3 гадз.

На дзенныя сэансы ўсе білеты па 25 кап.

Каса ад 12 гадз. дня.

Вячэрнія сэансы: 7 г., 8 г. 30 м., 10 г. 20 м.

Каса ад 5 гадз.

КІНО Пралетары

2 фільмы ў адзін сэанс 2

1. Палітасьветны фільм ЗА ВАША ЗДАРОЎЕ ў 5 част.

У галоўных ролях: Чысьцяноў і Блюмэнталь-Тамарына.

2. Замежная камэдыя Цёмны канёк у 2 частках.

Пач. 1-га сэансу а 7 г. Каса з 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"

МАСТАЦКІ ФІЛЬМ паводле тэмы апавяданьня Анры Барбюса „Здань, якая не вярочаецца"

мэлядрама ў 7 частках.

Пач. 1-га сэансу а 2 гадз., 2-га—3 г. 30 м.

Каса адчынена ад 12 гадз.

КІНО СПАРТАК

Нямецкі баявік 2-е ЖЫЦЬЦЁ

драма ў 7 частках.

Пачатак 1-га сэансу а 7 г., 2-га—а 9 г., 3-га—а 10 г. 45 м.

Каса—ад 5 г. 30 м.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" З 18 КРАСАВІКА

Толькі 3 дні МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ВЫТВОРЧАСЬЦІ САВКІНО

ПАБОЧНАЯ ЖАНЧЫНА

Рэжысэр У. Пыр'еў.

У галоўных родях: Вольга Жызьнева, Е. В. Ольгіна, К. Градаполаў, Г. В. Музалеўоні, А. У. Жукаў.

Звыш праграмы КІНО-ХРОНІКА Савкіно № 6.

Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. увечары. На вячэрнія сэансы каса—ад 5 гадз.

На дзенныя сэансы каса адчынена ад 12 гадз. дня.

ВЫШЛА З ДРУКУ І ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ.

М. ДОМНІЧ—

КАЛГАСЫ і КЛЯСАВАЯ БАРАЦЬБА.

Стар. 85, цана 30 кап.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

БЕЛМЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЮ

ПАТРЭБНЫ ДЛЯ РАБОТЫ Ў КІРАЎНІЦТВЕ

інжынэр-будаўнік, інжынэр-мэханік,

ІНЖЫНЭР па плянаваньні рацыянапізатарскіх мерапрыемстваў і абмену вопытам,

інжынэр па плянаваньні вытворчасьці,

ІНЖЫНЭР па ліцейнай справе,

ІНЖЫНЭР па прафасьвеце,

ІНЖЫНЭР па тэхніцы бясьпечнасьці і аховы здароўя,

ТЭХНІК-БУДАЎНІК,

тэхнік па тэхніцы нармаваньня,

ЭКАНАМІСТЫ па групе сельска-гаспадарчых і мэт. вырабаў,

эканамісты па групе завод. машынабудаўніцтва

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.

Прапановы накіроўваць на адрасе:

Менск, Рыкаўская, 8, Белмэталяаб'яднаньню,

тэлефоны: 1-21, 1-33, 15-79.

МЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЕ.

ЭЛЬВОД даводзіць да ведама абанэнтаў ЭЛЕКТРА-ЭНЭРГІІ, што ў сувязі з неабходным рамонтам машын электра-станцыі і пераабсталяваньнем шчыта і камэр высокага напружаньня

1-га МАЯ г. г.

з 2-х гадзін уночы да 6-й гадз. ўвечары

БУДЗЕ СПЫНЕНА

ПАДАЧА ЭЛЕКТРА-ЭНЭРГІІ.

ГОРАЦКІ РАБФАК імя Галадзеда

АБВЯЩЧАЕ,

што ў сувязі з маруднай яўкай паступаючых у Горацкі рабфак,

ТЭРМІН падачы дакумантаў і ПРЫЁМ камандыруемых арганізацыямі на рабфак працягнут да 25-га красавіка ўключна.

Залічэньне-ж на рабфак адбудзецца з 25-га па 30-га красавіка.

Заняткі з новым наборам пачнуцца з 3-га мая.

Дэкан рабфаку ХВАСЬЦЮК.

Заходняя Абласная Кантора УСЕСАЮЗНАГА АБ'ЯДНАНЬНЯ „СТАЛЬ"

даводзіць да ведама зацікаўленых устаноў, што з 16-га красавіка г. г. работа канторы пераводзіцца

на перапынную пяціднёўку

з выхадным днём для ўсіх супрацоўнікаў канторы ў 3-ці дзень пяціднёўкі.

К-т Віцебскай Акруговай Страхавой Касы абвяшчае КОНКУРС на ўрача-загадчыка

дома адпачынку «Чырвоны Кастрычнік» пры ст. Завольша МБВ чыгункі.

Умовы: аклад утрыманьня 175 р., кватэра, опал і асьвятленьне.

Тэрмін падачы заяў да 20 красавіка г. г.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Наборн. кн. Плевако А. М., выд. ТПО ст. Прыяміна МБВ ч. 586
Матрыц. пасьведч. Плевако І. А., выд. Зьвенігародзк. ЗАГС'ам. 587
Асабов. пасьведч. Пятрова С. П., выд. 2 раён. Мен. міліцыі. 588
Канд. карт. № 10133, пасьведч. выд. Бабруйск. Акркалгассаюзам на імя Русецкага С. Г. 589-590
Наборн. кн. Баранчыка Г. У., выд. ТПО МБВ ст. Менск. 591
Пашпарт Здрока І. С., выд. б. Грысавіцк. вал. праўл. 592
Вайск. біл. № 470-478 Канапацкага І. А., выд. Менваенкаматам. 593
Пашпарт Райпес Р. Г., выд. Менміліцыяй. 594
Мэтрыка Бялевіч Е. М., выд. б. Узьлянск. царквой, Самахвалавіцкага р-ну. 595
Кн. на карм. дзіцяці Кугель Э. І., выд. Мен. страхкасай. 596
Патэнт, выд. Менакрфа на імя Ганда В. Г. 597
Лек. кн. Александроўскага В. П., выд. Мен. страхкасай. 598
Мэтрыч. вып. Манасевіча Б. А., выд. Мен. ЗАГС'ам. 599
Пасьведч. аб сканчэньні Камвузу імя Леніна, выд. на імя Грабштэйна А. Т. 600
Канд. біл. Менгарсавету № 607
Сакольчыка А. А. 601
Вайск. біл. Трушкевіча Ў. Ф., выд. Менваенкаматам. 602
Пашпарт, выд. Мен. міліцыяй, чл. біл. саюзу нархарч № 1600 Чыбушовай К. Р. 603-604
Пасьведч. № 382 Недапытальскага С. К., выд. ДПУ. 605
Мэтрыч. вып. Гордзінай П. Б., выд. Мен. ЗАГС'ам. 606
Кн. на кармл. дзіцяці Кагана М. Ф., выд. Менстрахкасай. 607
Чл. біл. саюзу працасьветы Езавіт Т. А. 608
Бірж